

НАШ ЧАЛАВЕК У КАТАЛОНІІ 7

ВЯЛІКАБРЫТАНІЯ ПАСЛЯ БРЭКСІТУ 13





Выдаецца з 9 чэрвеня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

8 ЛЮТАГА 2020 г. СУБОТА № 26 (29140)


## ЦЫТАТА ДНЯ



**Наталля КАЧАНАВА, старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу:**

*«2020 год асаблівы, бо будзе адзначацца 75-годдзе Вялікай Перамогі. Ён важны для нас, для нашых расійскіх партнёраў. Таму тэма VII Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі, які плануецца правесці восенню ў Мінску і Мінскай вобласці, — гістарычная спадчына Вялікай Перамогі як аснова развіцця сацыяльна-эканамічных і духоўных сувязяў народаў Беларусі і Расіі. Такая ўсёабдымная тэматыка, думаю, закране кожнага. Мы разлічваем на тое, што гэта будзе вельмі маштабнае мерапрыемства, якое дазволіць нам выйсці на новы ўзровень супрацоўніцтва па ўсіх кірунках».*

# ПОШУК КАМПРАМІСУ Ў НЯПРОСТЫХ УМОВАХ

**На тое, што надвор'е ў беларуска-расійскіх адносінах — рэч вельмі важная, Прэзідэнт Беларусі звяртаў увагу неаднойчы. Звычайна яно было дастаткова цёплае, але апошнім часам пачало крыху штарміць. Пэўны халадок у зносінах нібы адчула і сапраўднае надвор'е. З-за моцнага бурану і ветру на дзве гадзіны затрымаўся ў аэрапорце Унукава самалёт з урадавай расійскай дэлегацыяй і журналістамі.**



Фота БелТА.

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка і члены нашага прадстаўніцтва за дзень да перагавораў прыбылі ў Сочы, дзе размясціліся ў санаторыі «Беларусь» у Краснай Паляне. Тых, хто спазняўся, прэзідэнты чакаць не сталі, бо сустрэча пачалася з двухбаковых перагавораў у фармаце сняданку. Размову лідары пачалі з абмеркавання... кашы, якую гасцінна прапанаваў расійскі Прэзідэнт. Так па-сярбоўску, жартуючы, кіраўнікі краін перайшлі да больш сур'ёзных пытанняў. Як расказаў пасля Аляксандр Лукашэнка, пагаварылі пра многае: дайшлі да сівых часоў суменсага жыцця ў адной дзяржаве, абмеркавалі пытанні, якія датычацца суседзяў, былых краін Савецкага Саюза, той палітыкі, якая праводзіцца цяпер. «Пра многае пагаварылі, дайшлі да сучаснасці і вырашылі ўжо не сам-насам, а з тымі, хто ўключаны ў гэты працэс, працягнуць нашу гутарку», — паведаміў беларускі лідар.

Сочынская сустрэча працягнулася ў пашыраным фармаце. Аднак не ўсе члены расійскай дэлегацыі да таго часу змаглі дабраца да Сочы — зноў жа з-за складаных умоў надвор'я. Акрамя прэзідэнтаў, на першым раўндзе перагавораў з беларускага боку прысутнічалі першы віцэ-прэм'ер Дзмітрый Крутой, пасол Беларусі ў Расіі Уладзімір Сямашка, міністр энергетыкі Віктар Каранкевіч і старшыня канцэрна «Белнафтахім» Андрэй Рыбакоў, з расійскага — намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Дзмітрый Козак, гендырэктар «Расатама» Аляксей Ліхачоў і пасол Расіі ў Беларусі Дзмітрый Мезенцаў.

СТАР. 2

## КОРАТКА

- **Беларускія балельшчыкі выбралі Хрушча талісманам ЧС-2021 па хакеі. Афіцыйны талісман стане вядомы 24 лютага.**
- Мінск увайшоў у топ-3 гарадоў СНД з самымі цікавымі мерапрыемствамі на 23 лютага.
- **Беларусы ў студзені купілі валюты на $44,8 млн больш, чым прадалі.**
- Кошт квадратнага метра жылля з дзяржпадтрымкай у 2019 годзе быў ніжэйшы за сярэднюю зарплату.
- **Беларусь і Расія плануюць да 1 сакавіка сфарміраваць агульны спіс невыязных грамадзян.**
- Пасольства Манголіі плануецца адкрыць у Беларусі.
- **Дні культуры Беларусі ў 2020 годзе пройдуць у Амане, Казахстане, Расіі і Украіне.**
- Колькасць чмялёў у Еўропе і Паўночнай Амерыцы за 50 гадоў знізілася на траціну.

Духоўнасць

# Святыні, што нас аб'ядноўваюць



Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

**У маі 2020 года Жыровіцкі Свята-Успенскі стаўрапігіяльны мужчынскі манастыр святкуе адразу тры знакавыя падзеі: 550-годдзе з'яўлення цудатворнай іконы Божай Маці Жыровіцкай, 500-годдзе паўторнага знаходжання іконы і 500-годдзе заснавання самога манастыра. Да юбілейных дат прымеркавана мноства не толькі рэлігійных, але і культурных і навуковых мерапрыемстваў: выстаўкі, навукова-практычныя канферэнцыі, семінары, прэзентацыя кніжных праектаў, цыкл тэле- і радыёпраграм.**

Адным з першых падарункаў да юбілею стала кніга «Усерадаснае заступленне Белай Русі». Як расказвае яе аўтар-укладальніца ігумення Гаўрыіла (Марыя Глухава), настаяцельніца Свята-Ражство-Багародзічнага жаночага манастыра ў Гродне, — гэта спроба ўпершыню скласці поўную «біяграфію» абіцелі як апоры высокай духоўнасці на беларускіх землях ад часу заснавання манастыра да нашых дзён, расказаць пра яе насельнікаў і наменікаў у розныя часы, падзвіжнікаў веры, пра перыяды заняпаду і адраджэння ў гэтых сценах Мінскай духоўнай семінарыі.

СТАР. 5

У цэнтры ўвагі

# ШКОЛЬНЫЯ ВЕДЫ

## БЕЗ АДРЫВУ АД ЖЫЦЦЯ

### У Міністэрстве адукацыі агучылі задачы на найбліжэйшую перспектыву

**Роля псіхолага ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі будзе перагледжана. У краіне з'явіцца Этычны кодэкс педагога. Выпускныя экзамены ў школе могуць аб'яднаць з уступнымі іспытамі ў ВНУ. Таксама разглядаецца магчымасць укаранення ў 1—11 класах модульна-блочнага падыходу і інтэграваных навучальных курсаў. Такія планы анансаваў на выніковай калегіі свайго ведамства міністр адукацыі Ігар КАРПЕНКА.**

СТАР. 4



Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

ISSN 1990 - 763X

# ПОШУК КАМПРАМІСУ Ў НЯПРОСТЫХ УМОВАХ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Пасля завяршэння першага раўнда перагавораў Аляксандр Лукашэнка і Уладзімір Пуцін выйшлі на лёд спартыўна-культурнага комплексу «Галактыка», дзе правялі таварыскі хакейны матч. Паказальна, што прэзідэнты Беларусі і Расіі гулялі ў адной камандзе.

Тым часам расійскі борт, дзе ляцелі віцэ-прэм'ер Аляксей Аврэчук, міністр энергетыкі Аляксандр Новак і першы намеснік міністра эканамічнага развіцця Міхаіл Бабіч, перачакаўшы непагадзь у аэрапорце Мінеральныя Воды, прызямліўся ў Сочы. Перагаворы ў поўным складзе працягнуліся пасля матча.

***

Па выніках перагавораў, другі раўнд якіх скончыўся а дзясятай гадзіне вечара, намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Расіі Дзмітрый Козак паведаміў журналістам, што Расія будзе пастаўляць газ у Беларусь на ўмовах 2019 года.

«Перагаворы прайшлі ў вельмі пазітыўным ключы. Дамовіліся працягнуць кансультацыі на ўзроўні ўрада, міністэрстваў і ведамстваў па ўдасканаленні механізмаў інтэграцыі. Што датычыцца супрацоўніцтва ў нафтагазавай сферы, то мы дамовіліся захаваць пастаўкі газу на ўмовах 2019 года. Будзем дзейнічаць у гэтым ключы», — сказаў Дзмітрый Козак.

Ён удакладніў, што ўмовы паставак газу агавораны толькі на 2020 год.

У 2019 годзе цана на газ для Беларусі з'яўлялася фіксаванай і складала $127 за тысячу кубічных метраў на граніцы. На аналагічных умовах газ пастаўляецца і ў студзені — лютым бягучага года.

«Што датычыцца пастаўкі нафты, якая таксама была прадметам абмеркавання, мы будзем аказваць садзейнічанне дасягненню пагадненняў паміж беларускімі спажыўцамі і вытворцамі нафты ў нашай краіне. Мы не можам сёння рэзка памяняць умовы рэгулявання нашай нафтавай галіны. Цэны на сырую нафту фарміруюцца рынкам і адміністрацыйна не рэгулююцца. Гэта ўсё застанецца. Але мы будзем аказваць усялякае садзейнічанне дасягненню гэтых пагадненняў, каб забяспечыць Беларусь неабходнымі аб'ёмамі нафты», — сказаў Дзмітрый Козак.

Паводле яго слоў, расійскі і беларускі нафтавыя рынкі адзіныя і нафта прадаецца на аднолькавых умовах, а для давання скідак неабходна было б уводзіць дзяржрэгуляванне гэтага рынку. «Што мы зрабіць не зможам. Мы не можам увесь час мяняць правілы гульні: мы паставім у незразумелае становішча нашы нафтавыя кампаніі. Таму будзем спрыяць дасягненню камерцыйных дамоўленасцяў», — паведаміў спікер.

З гэтай жа прычыны Дзмітрый Козак не змог удакладніць, колькі расійскай нафты будзе пастаўлена ў Беларусь у першым квартале бягучага года. «Гэта ўсё залежыць ад дасягнення дамоўленасцяў. Аб'ёмы, цану паставак мы не рэгулюем», — заявіў ён.

**Паводле БелТА.**

## Блізкая ўлада

# ТРЫМАЦЬ РУКУ НА ПУЛЬСЕ ЖЫЦЦЯ ГРАМАДСТВА

**Адміністрацыя Прэзідэнта працягвае прыём грамадзян і юрыдычных асоб. Сустрэчы пройдуць з 11 да 14 лютага.**

**У аўторак 11 лютага** ў **Баранавічах** жыхароў прыме памочнік **Прэзідэнта — інспектар па Брэсцкай вобласці Анатоль МАРКЕВІЧ,** у **Оршы — памочнік Прэзідэнта — інспектар па Віцебскай вобласці Анатоль ЛІНЕВІЧ,** у **Мастах — першы намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення па рабоце са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб — начальнік упраўлення пісьмовых і электронных зваротаў Хрысціна ПОБАЛЬ.**

**12 лютага** на прадпрыемстве «Белджы» **ў Барысаве** сустрэнецца з працоўным калектывам і выслухае звароты **кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Ігар СЕРГЕЕНКА.** У гэты ж дзень жыхары сталіцы ў адміністрацыі **Ленінскага раёна Мінска** змогуць звярнуцца да памочніка **Прэзідэнта — інспектара па Мінску Віталя ПРЫМЫ.**

**У чацвер** праблемы быхаўчан выслухае **намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Андрэй КУНЦЭВІЧ,** а **намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення — начальнік упраўлення ідэалогіі і інфармацыйнай палітыкі галоўнага ідэалагічнага ўпраўлення Уладзімір МАТУСЕВІЧ** правядзе прыём грамадзян у Добрушы.

**У пятніцу, 14 лютага,** са зваротамі грамадзян будзе працаваць у **горадзе Бярозаўка Лідскага раёна памочнік Прэзідэнта — інспектар па Гродзенскай вобласці Іван ЛАЎРЫНОВІЧ,** у **Петрыкаве — намеснік начальніка ўпраўлення кіруючых кадраў і дзяржаўных узнагарод галоўнага ўпраўлення кадравай палітыкі Аляксей ГУЙДА.**

Марыя ДАДАЛКА.

## Парламенцкі дзённік

# Не кампенсацыя, а пашырэнне магчымасцяў

**У Беларусі плануецца замацаваць норму аб абавязковым устанаўленні квоты для прыёму на работу інвалідаў і даць ім права бясплатнага карыстання аўтамабільнымі паркоўкамі.**

Такія нормы змяшчаюцца ў новым законапраекце «Аб правах інвалідаў і іх сацыяльнай інтэграцыі». Пра гэта паведаміла журналістам **старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па працы і сацыяльных пытаннях Людміла КАНАНОВІЧ.**

— Чакаецца, што квоты будуць вызначаць для прадпрыемстваў, дзе працуе не менш за 100 чалавек, — сказала старшыня камісіі. — Хацелася б, каб гэта былі ўжо абсталяваныя месцы, каб чалавек з абмежаванымі магчымасцямі мог там адразу прыступіць да работы. Квоты па працаўладкаванні людзей з інваліднасцю плануецца ўвесці ў 2023 годзе.

Для грамадзян з абмежаванымі магчымасцямі таксама прапануюць паслугі персанальных асістэнтаў. Гэта будуць людзі з ліку сацыяльных работнікаў, якія пасля спецыяльнага навучання змогуць выступаць у якасці суправаджаючых для людзей з абмежаванымі магчымасцямі.

Людміла Кананович канстатавала, што ва ўсім свеце колькасць людзей з інваліднасцю даволі значная, і тэндэнцыя такая, што яна працягвае расці. У Беларусі на 1 студзеня 2020 года на ўліку ў органах па сацабароне знаходзілася амаль 574 тысячы такіх грамадзян, з іх інвалідаў 1-й групы — 87 тысяч, 2-й групы — 360 тысяч. Сярод інвалідаў у Беларусі налічваецца больш за 33 тысячы дзяцей. Удзельная вага такіх людзей у агульнай колькасці насельніцтва складае 6 %.

Да нядаўняга часу айчынная сацыяльная палітыка ў адносінах да інвалідаў насіла пераважна кампенсацыйны характар. У асноўным усё зводзілася да давання льгот і грашовых выплат. Цяпер на першы план выходзяць задачы па забеспячэнні інвалідаў роўнымі з іншымі грамадзянамі магчымасцямі: стварэнні ўмоў для максімальнай рэалізацыі сябе ў працоўнай дзейнасці, адукацыі, спорце. У праект закона ўведзеныя новыя тэрміны і паняцці — «абілітацыя інваліда», «універсальны дызайн», «мова жэстаў», «разумнае прыстасаванне».

Прадугледжана магчымасць стварэння цэнтраў рэабілітацыі і абілітацыі на рэспубліканскім і мясцовым узроўнях. Такія цэнтры могуць утварацца як па адным, так і па некалькіх кірунках, уключаць медыцынскую, сацыяльную, прафесійную дапамогу.

Новы дакумент абмяркоўваўся на пасяджэнні профільнай парламенцкай камісіі. Дэпутаты плануюць прыняць яго ў першым чытанні на вясновай сесіі.

**Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Прэм'ер-міністр Іспаніі і лідар Каталоніі дамовіліся аб пачатку дыялогу

Прэм'ер-міністр Іспаніі Пэдра Санчэс і лідар Каталоніі Кім Тора дамовіліся пачаць дыялог паміж цэнтральным і рэгіянальным урадамі ўжо ў бягучым месяцы. Аб гэтым заявіў Санчэс па выніках сустрэчы ў Барселоне з Торай, перадае ТАСС. Прэм'ер-міністр звярнуў увагу на тое, што для ўрэгулявання канфліктаў неабходна весці дыялог. Палітыкі дамовіліся правесці першую сустрэчу двухбаковай камісіі паміж урадамі ў лютым. «Я ведаю, што шлях будзе нялёгкі, — дадаў кіраўнік кабінета міністраў Іспаніі. — Ёсць глыбокія раны, якія так хутка не гояцца». Пры гэтым Санчэс падкрэсліў, што з'яўляецца «цвёрдым абаронцам самакіравання Каталоніі».

### Кіраўнік Цюрынгіі сышоў у адстаўку праз дзень пасля абрання



Прэм'ер-міністр германскай федэральнай зямлі Цюрынгія Томас Кемерых, прадстаўнік ліберальнай Свабоднай дэмакратычнай партыі, абраны на сваю пасаду напярэдадні, заявіў аб тым, што сыдзе ў адстаўку. Сваё рашэнне ён назваў «непазбежным» — пасля хвалі крытыкі з-за таго, што яго абранне стала магчымае дзякуючы падтрымцы правапапулісцкай партыі «Альтэрнатыва для Германіі»(АдГ). Кемерых заявіў, што зямельны парламент павінен быць распушчаны і варта правесці новыя выбары. Напярэдадні ён быў абраны прэм'ерам, атрымаўшы на адзін голас больш, чым папярэдні прэм'ер Цюрынгіі Бода Рамелоў з Левай партыі. Ён перамог дзякуючы падтрымцы дэпутатаў са сваёй уласнай партыі, Хрысціянска-дэмакратычнага саюза і «Альтэрнатывы для Германіі». Такім чынам, АдГ упершыню наўпрост паўплывала на вынікі выбараў у краіне. Канцлер ФРГ Ангела Меркель, якая рэдка каментуе ўнутрыпалітычныя падзеі, заклікала адмяніць вынікі галасавання ў ландтагу Цюрынгіі. Па яе словах, тое, што адбылося, стала дрэнным днём для дэмакратыі.

### Навукоўцы расшыфравалі ракавыя клеткі і абяцаюць рэвалюцыю ў лячэнні



Міжнародная каманда навукоўцаў упершыню цалкам расшыфравала генетычную інфармацыю 38 відаў ракавых клетак, склаўшы вычарпальны каталог мутацый ДНК, якія прыводзяць да развіцця анкалагічных захворванняў. Беспрэцэдэнтнае па маштабе даследаванне «Аналіз поўнага геному ўсіх відаў раку» (PCAWG) заняло больш за 10 гадоў. У працы ўзяло ўдзел каля 1300 генетыкаў з 37 краін, а яе вынікі былі апублікаваныя адразу ў двух дзясятках навуковых часопісаў. Па словах навукоўцаў, прычыны ўзнікнення раку можна параўнаць з пазлам, які складаецца са 100 тысяч кавалачкаў. Да сённяшняга дня мы спрабавалі сабраць агульную карціну, маючы на руках толькі кожны соты фрагмент, і толькі цяпер можам зірнуць на яе цалкам. «З дапамогай сабранай інфармацыі аб паходжанні і развіцці пухлін мы можам распрацаваць новыя спосабы ранняй дыягностыкі рака, больш накіраваныя метады тэрапіі і лячыць пацыентаў з вялікім поспехам», — заявіў член каардынацыйнага камітэта PCAWG Лінкальн Стайн.


## Извещение о проведении 26 февраля 2020 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 7»

| Предмет торгов |
| --- |
| Грузовая специальная машина дорожная комбинированная на базе MAZ 6303 А5-352, год выпуска – 2010, регистрационный знак АВ 9188-4, инвентарный номер 047428 |
| Местонахождение: Гродненская обл., г. Лида, проспект Победы, 168-б |
| **Начальная цена: 43 541,67 бел. руб.** без учета НДС |
| Сумма задатка: 4000,00 бел. руб. |

**Продавец имущества:** ОАО «ДСТ № 7», 223021, Минская обл., Минский р-н, 500 м восточнее д. Богатырево, АБК, тел. (017) 507-61-83.

**Организатор торгов:** государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск, тел. (017) 327-05-62.

**Условие торгов:** победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 3 процентов от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст. ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества ОАО «ДСТ № 7», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица, а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» № BY34 BPSB 3012 1049 7101 9933 0000 в Региональной дирекции № 700 по г. Минску и Минской области ОАО «БПС-Сбербанк», БИК BPSBBY2X, УНП 190398583, в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и не включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи. По согласованию с продавцом возможна рассрочка платежа.

Торги проводятся **26 февраля 2020 года** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 10.02.2020 по 24.02.2020** включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефоны для справок: (017) 327-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»); (033) 333-80-52 (ОАО «ДСТ № 7»)

На слыху

# Дадатковыя меры бяспекі

## Студэнтаў з Кітая размесцяць у цэнтры «Брыганціна», а работнікі «Вялікага камня» каранцін правядуць у сваіх кватэрах

**Для студэнтаў, якія прыбываюць з Кітая, падрыхтаваны месцы ў аздараўленчым цэнтры «Брыганціна» Белдзяржуніверсітэта. Работнікі «Вялікага камня», якія таксама вяртаюцца з КНР пасля навагодніх свят па месячным календары, правядуць двухтыднёвы каранцін у сваіх кватэрах. Пра гэта паведаміла прэс-сакратар Міністэрства аховы здароўя Юлія БАРАДУН.**

— З мэтай дадатковай прафілактыкі і ў адпаведнасці з пажаданнямі студэнтаў, якія не выязджалі ў КНР, прынята рашэнне аб выдзяленні дадатковых месцаў на базе аздараўленчага комплексу «Брыганціна» БДУ для студэнтаў, якія прыбудуць у Беларусь з тых рэгіёнаў Кітая, што не закрыты на каранцін і дзе не зарэгістраваны выпадкі захворванняў. Падкрэслю, што размова ідзе пра дадатковыя меры для студэнтаў, якія не былі ў кантакце з хворымі і не наведвалі эпідэмічна небяспечныя раёны, — расказала Юлія Барадун.

Як мы паведамлялі раней, для выезду з эпідэмічна небяспечных раёнаў КНР грамадзяне Кітая павінны прайсці 14-дзённы каранцін на радзіме, і толькі пасля гэтага могуць атрымаць дазвол на выезд.

Цяпер у аздараўленчы цэнтр «Брыганціна» накіраваны спецыялісты. Тут усё падрыхтавалі для таго, каб людзі маглі камфортна правесці два тыдні. Усе медыцынскія супрацоўнікі, якія будуць працаваць у цэнтры, прайшлі дадатковую падрыхтоўку.

Для студэнтаў, якія вярнуліся з Кітая, тут будзе арганізавана індывідуальная форма навучання ў анлайн-рэжыме. Такія ж меры эпідэмічнай бяспекі ўведзены ва ўсіх абласцях краіны, дзе вучацца студэнты з КНР.



Паводле даных Міністэрства адукацыі, зараз у Беларусі вучыцца каля пяці тысяч студэнтаў з Кітая. На канікулы за межы краіны выехала 920 чалавек.

— Што датычыцца работнікаў «Вялікага камня», то ў Мінску чакаюць вяртання каля 80 чалавек — размова ідзе пра тых работнікаў, якія таксама не былі ў каранцінных зонах. Усе яны таксама правядуць двухтыднёвы аплачваемы каранцін у сваіх кватэрах, паколькі ў парку ўведзены дадатковыя меры бяспекі для супрацоўнікаў. Адміністрацыя парку завяршае закупку усіх неабходных сродкаў для санапрацоўкі тэрыторыі. Са Смалявіцкай раённай бальніцай устаноўлены кантакт, каб у межах кансалтынгавай дапамогі найлепшым чынам арганізаваць усе мерапрыемствы па ахове здароўя супрацоўнікаў. Акрамя таго, у першым жылым доме на тэрыторыі парка ўжо ўведзены ў строй фельчарскі пункт. Цяпер там пастаянна знаходзіцца медыцынскі супрацоўнік, — расказала Юлія Барадун.

У парку інфармуюць персанал аб тым, як атрымаць медыцынскую дапамогу і прытрымлівацца мер прафілактыкі. Распрацавана памятка па папярэджанні распаўсюджвання інфекцыйных хвароб, у прыватнасці каранавіруса 2019-nCoV.

Прэс-сакратар нагадала, што ў Беларусі праводзіцца комплекс санітарна-супрацьэпідэмічных мерапрыемстваў, накіраваных на папярэджанне завозу і распаўсюджвання інфекцыі, выкліканай новым каранавірусам 2019-nCoV. У прыватнасці, у пунктах пропуску на дзяржаўнай мяжы праводзіцца ўзмоцнены санітарна-каранцінны кантроль асоб, якія прыбываюць на тэрыторыю краіны, у тым ліку з выкарыстаннем цеплавізарнага абсталявання (у Нацыянальным аэрапорце «Мінск» забяспечана правядзенне двайнога санітарна-каранціннага кантролю). Апроч гэтага, у 23 пунктах пропуску праз дзяржаўную мяжу арганізаваны забор матэрыялу (мазок са слізістай) для лабараторнага абследавання грамадзян, якія прыбываюць з КНР.

Нагадаем, што ўсім грамадзянам, якія наведвалі Кітай і іншыя краіны, дзе распаўсюджаны вірус, у выпадку з'яўлення сімптомаў (павышэнне тэмпературы, кашаль, адышка, боль у горле) на працягу 14 дзён пасля вяртання трэба неадкладна выклікаць «хуткую», падчас выкліку паведамiць пра сімптомы і дату прыбыцця з Кітая.

Па стане на 7 лютага за час правядзення мерапрыемстваў у сувязі з успышкай каранавіруса ў Беларусі былі ўзяты пробы ў больш чым паўтысячы грамадзян, якія раней знаходзіліся ў КНР. Каранавірус не выяўлены. У больш чым сотні з іх дыягнаставаны сімптомы вострай рэспіраторнай інфекцыі. Усе яны шпіталізаваны ў інфекцыйныя стацыянары, ім аказалі неабходную медыцынскую дапамогу і правялі дадатковыя лабараторныя даследаванні.

Беларусы, якія наведвалі ў Кітаі эпідэмічна небяспечныя рэгіёны, цяпер знаходзяцца на каранціне ў Расіі і Казахстане.

**Алена КРАВЕЦ.**

<u>Уладзімір КАРАНІК</u>:

# «Супакоіць студэнцтва, мінімізаваць рызыкі»

**Рызыка завозу ў нашу краіну каранавіруса існуе, але яна кантраляваная і не вельмі высокая. Пра гэта ўчора расказаў міністр аховы здароўя Уладзімір КАРАНІК.**

Каб знізіць імавернасць завозу інфекцыі і супакоіць студэнтаў, прынята рашэнне: кітайскіх студэнтаў, якія вяртаюцца з КНР пасля канікул, сяліць асобна. У прыватнасці, у Мінску для гэтага прызначаны прафілакторый БДУ «Брыганціна».

— У тых навучальных установах, дзе ёсць магчымасць пасяліць іх асобна, гэта будзе зроблена. Астатніх мы пасяляем у прафілакторый «Брыганціна». Гэта здаровыя людзі, якія не былі ў кантакце з хворымі, не наведвалі эпідэмічна небяспечных раёны і не маюць прыкмет рэспіраторнай інфекцыі, — адзначыў Уладзімір Каранік.

Учора ў Беларусь прыбыла група такіх студэнтаў — каля 30. Яны будуць заселены ў падрыхтаваныя пакоі комплексу. У кожным рэгіёне таксама прымаюць такія меры, у прыватнасці, у Віцебскай вобласці выдзелены спецыяльны прафілакторый для кітайскіх студэнтаў.

Як адзначыла **намеснік галоўнага ўрача па эпідэміялогіі Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Ірына ГЛІНСКАЯ,** прырост новых выпадкаў каранавіруса ў свеце зніжаецца. Калі ў канцы студзеня ён складаў 39 % за дзень, то на мінулых выхадных — 30—22 %. А за 6 лютага такі прырост склаў 11 %.

— Гэта сведчыць пра тое, што меры, якія прымаюцца ў КНР, дзейнічаюць. Канешне, колькасць новых выпадкаў павялічваецца, бо колькасць крыніц хваробы значная, але тэмп прыросту паступова замаруджваецца. Бо прыняты беспрэцэдэнтныя меры бяспекі: забаронена перасоўванне за межы правінцыі Хубэй, не праводзіцца масавыя мерапрыемствы, амаль не працуюць грамадскі транспарт і прадпрыемствы. Мяркуючы па прагнозах, рост колькасці новых выпадкаў яшчэ будзе, але потым яна паступова пойдзе на спад, — падкрэсліла Ірына Глінская.

Па звестках на раніцу 7 лютага медыкі пацвердзілі 31 161 выпадак захворвання на каранавірус у Кітаі, 1540 чалавек ужо вылечылася, 636 памерла.

**Алена КРАВЕЦ.**

# УСЕ СЛУЖБЫ НАПАГАТОВЕ

## У Брэсце прайшлі вучэнні па барацьбе з распаўсюджваннем каранавіруса

**Вучэнні адбыліся на базе абласной інфекцыйнай бальніцы. Паводле легенды, з пункта пропуску «Варшаўскі мост» прыйшло паведамленне аб тым, што мяжу перасякае дзяўчына з характэрнымі сімптомамі: высокая тэмпература, кашаль. Важнае ўдакладненне, дзяўчына напярэдадні прыляцела ў Варшаву з Кітая. На пагранпераход выехала машына хуткай дапамогі, а ў бальніцы сталі рыхтаваць асобную палату.**

Медыкі выкарысталі спецыяльныя супрацьчумныя касцюмы, а пацыентку змясцілі ў біябокс для транспарціроўкі. Перад гэтым яе агледзеў урач. Пасля таго як «хворую» даставілі ў бальніцу, каталку, бокс, касцюмы ўрачоў апрацавалі спецыяльнымі сродкамі. І ўжо ў бальніцы правялі патрэбныя маніпуляцыі, узялі аналізы.

Як адзначыў **начальнік галоўнага ўпраўлення аховы здароўя Брэсцкага аблвыканкама Віктар МІХАЙЛОЎСКІ,** дакладнасць і зладжанасць дзеянняў усіх службаў вельмі важная на шляху заслоны для пранікнення каранавіруснай інфекцыі на тэрыторыю краіны. Асабліва гэта актуальна для памежнага рэгіёна.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

# «ІМПУЛЬС» СПАРТЫЎНАГА ЖЫЦЦЯ Ў АСТРАЎЦЫ

## У горадзе энергетыкаў запрацаваў шматфункцыянальны комплекс

**Двухпавярховы спартыўна-аздараўленчы комплекс са спартзалай для баскетбола, валейбола, гандбола і міні-футбола, 25-метровым басейнам глыбінёй 1,76 і 1,44 метра, саўнай, трэнажорнай залай, фітнес-каврарняй, дзвюма фітнес-заламі, залай для заняткаў дзюдо, вольнай і грэка-рымскай барацьбой стаў шыкоўным падарункам да 80-гадовага юбілею Астравецкага раёна. Гэта ўжо другі сацыяльна-значны аб'ект, які адкрыўся ў горадзе ўсяго за тыдзень. У мінулую пятніцу ў новы будынак пераехала і адразу прыняла першых пацыентаў Астравецкая цэнтральная раённая бальніца. Мяркуецца, што сёлета ў горадзе з'явіцца яшчэ і лядовы каток.**

Прапускная здольнасць шматфункцыянальнага комплексу, дзе можна займацца больш чым 20 відамі спорту, — аднамомантна 221 чалавек. Трыбуны разлічаны на 751 месца. На ўзвядзенне «Імпульсу» за два гады спатрэбілася больш чым 15,5 мільёна рублёў.



Працаваць 24 гадзіны ў суткі спарткомплексу і атрымліваць адрэналін і здароўе яго наведвальнікам пажадаў **старшыня Гродзенскага абласнога выканаўчага камітэта Уладзімір КРАЎЦОЎ:**

— Год таму ў Астраўцы з'явіўся цудоўны стадыён з футбольным полем і бегавымі дарожкамі. Увосень на базе першай гімназіі ў межах рэалізацыі сацыяльна-спартыўнага праекта адкрылі суперсучасную пляцоўку (кажуць, найлепшую ў краіне) для баскетбола.

Кіраўнік вобласці выказаў надзею, што тут будуць нараджацца зорачкі і зоркі спорту, чэмпіёны краіны, Еўропы і свету, і падарыў спарткомплексу сертыфікат на 5000 рублёў для набыцця інвентару. «Імпульс» ужо аснашчаны больш чым тысячай адзінак разнастайнага абсталявання, якім напоўніцу карысталіся першыя наведвальнікі трэнажоркі і басейна.

— Гэтае месца стане цудоўнай найсучаснейшай пляцоўкай для развіцця камандных, гульнявых і індывідуальных відаў спорту, масавых мерапрыемстваў накшталт канцэртаў і навагодніх ёлак. У кавярні будзе спецыяльнае фітнес-харчаванне, у тым ліку кіслародных кактэйлі. У трэнажорнай зале, якая ўкамплектавана сучаснымі трэнажорамі, адначасова могуць трэніравацца 40 чалавек, — расказаў пра магчымасці комплексу **Аляксей ДВАРЭЦКІ, загадчык сектара спорту і турызму Астравецкага райвыканкама.**

Пасля ўрачыстага адкрыцця ў спартзале прайшоў першы матч па міні-футболе. Права першага ўдару дасталося **міністру спорту і турызму Сяргею КАВАЛЬЧУКУ.** Ён пажадаў юным і дарослым спартсменам вялікіх вынікаў і дасягненняў, каб яны ўдыхалі жыццё ў спарткомплекс, які не павінен прастойваць ні гадзіны.

«Імпульс» не стане адзінай установай такога ўзроўню ў вобласці. У межах праграмы развіцця спорту і матэрыяльна-тэхнічнай базы спартаб'ектаў у Навагрудку ўзводзіцца такі ж цудоўны шматфункцыянальны палац, які пачне працаваць літаральна праз два месяцы, а праз месяц прыме наведвальнікаў басейн у Смаргоні, заўважыў Уладзімір Краўцоў:

— У планах таксама будаўніцтва футбольных палёў і стадыёнаў у Ваўкавыску, Гродне. Вызначаемся з фарматам спартыўнага аб'екта ў Слоніме. Палац там будзе больш арыентаваны на водныя віды спорту. У Гродне сёлета павінны адкрыцца тэнісныя корты добрага ўзроўню.

З 7 лютага комплекс пачаў працу ў звычайным рэжыме — з васьмі гадзін раніцы да дзесяці вечара.

**Ірына СІДАРОК, фота аўтара.**

# ШКОЛЬНЫЯ ВЕДЫ
## БЕЗ АДРЫВУ АД ЖЫЦЦЯ

### Як разгрузіць старшакласнікаў?

— Рэзервы ў скарачэнні нагрузкі на навучэнцаў без шкоды для якасці адукацыі ёсць, — падкрэсліў ён. — Прадметы, на вывучэнне якіх адводзіцца, напрыклад, адна гадзіна ў тыдзень на працягу двух гадоў, лепш засвойваць на працягу аднаго вучэбнага года, праводзячы заняткі па дзве гадзіны ў тыдзень. Такім чынам можна палепшыць засваенне матэрыялу, пры гэтым навучэнцы змогуць сканцэнтраваць свае намаганні на паглыбленні ў профільныя прадметы. Зэканоміць сілы і час на вывучэнне няпрофільных прадметаў можна праз укараненне інтэграваных курсаў. Праграма 11 класа разгрузіцца, і ў выпускнікоў вызваліцца час для вывучэння факультатыўных курсаў. А гэта дазволіць перайсці да навучання па індывідуальных вучэбных планах.

На думку міністра адукацыі, трэба адкарэктаваць вучэбную праграму па інфарматыцы, паколькі большасць сучасных дзяцей прыходзяць у школу, ужо маючы першасныя навыкі валодання гаджэтамі. Гэта абумоўлена таксама і актыўным укараненнем у школах STEM-адукацыі, якая рэалізуецца сумесна з Паркам высокіх тэхналогій. «Тут неабходна распрацаваць адзіныя падыходы да яе арганізацыі і зместу», — лічыць ён.

У 10—11-х класах з гэтага года прадугледжана магчымасць вывучэння інфарматыкі на базавым і павышаным узроўнях. На думку Ігара Карпенкі, у рамках дапрофільнага навучання такую магчымасць трэба даць таксама восьмым і дзявятым класам. І нават прадугледзець там вывучэнне некалькіх моў праграмавання. Яшчэ адна магчымасць разгрузіць старшакласнікаў — сумяшчэнне выпускных экзаменаў за школу з цэнтралізаваным тэсціраваннем.

Міністр прывёў дадзеныя незалежнага даследавання: большасць апытаных бацькоў, настаўнікаў і вучняў падтрымалі прапанову аб'яднаць выпускныя і ўступныя экзамены, напрыклад, па рускай, беларускай мове і па матэматыцы. Знайшла падтрымку і ідэя са здачай выпускнога экзамена па замежнай мове ў вуснай форме.

### Акцэнт — на кампетэнтнасны падыход

У 2018 годзе Беларусь упершыню ўдзельнічала ў міжнародным даследаванні адукацыйных дасягненняў навучэнцаў PISA-2018. Паводле вынікаў, якія былі агучаны толькі ў снежні 2019 года, нашы 15-гадовыя падлеткі прадэманстравалі ўзровень, крыху вышэйшы за сярэдні, заняўшы месца ў першай палове агульнасусветнага рэйтынгу.

— Правёўшы ў бліжэйшыя месяцы глыбокі навуковы аналіз атрыманых вынікаў, мы прымем узважаныя рашэнні па далейшым развіцці агульнай сярэдняй адукацыі, якая, як мы плануем, павінна стаць абавязковай, — паабяцаў Ігар Карпенка. — Удзел у даследаванні дазволіў вызначыць шэраг задач, над якімі нам трэба будзе працаваць у бліжэйшай перспектыве. У першую чаргу, гэта ўдасканаленне навукова-метадычнага забеспячэння. Заданні, накіраваныя на прымяненне засвоеных ведаў, уменняў і навыкаў у розных жыццёвых сітуацыях, аналагічныя заданням PISA, павінны ўвайсці ў вучэбна-метадычныя комплексы. Ужо выдадзена серыя дапаможнікаў для настаўнікаў першых — дзявятых класаў з акцэнтам на кампетэнтнасны падыход. Задача педагога — мэтанакіравана выкарыстоўваць іх у вучэбным працэсе. У найбліжэйшай будучыні перад намі стаіць таксама задача сфарміраваць у краіне высокапрафесійны экспертны патэнцыял у вобласці ацэнкі якасці адукацыі...

А вось тая акалічнасць, што навучэнцы беларускіх гімназій і ліцэяў паказалі на PISA вынікі на ўзроўні сваіх равеснікаў з краін-лідараў — Кітая і Сінгапура — пацвярджае, на думку міністра, правільнасць прынятага рашэння аб прадастаўленні вучням звычайных сярэдніх школ магчымасці, таксама, як і гімназістам, вывучаць асобныя прадметы на павышаным узроўні, пачынаючы ўжо з другой ступені агульнай сярэдняй адукацыі. **Ігар Карпенка ўпэўнены: менавіта забеспячэнне роўных магчымасцяў усім без выключэння навучэнцам, незалежна ад месца іх пражывання (у горадзе ці сельскай мясцовасці), сацыяльнага статусу, колькасці вучняў у школе ці ў класе, прынясе ў будучыні станоўчыя вынікі.**

> **«Рыхтуючы нарматыўныя акты, трэба працаваць на перспектыву, а не толькі замацоўваць тое, што ўжо рэалізуецца на практыцы».**

### Супраць гвалту

У сваім выступленні на калегіі Ігар Карпенка звярнуў увагу на **актуальнасць інфармацыйнай прысутнасці ўстаноў адукацыі ў інтэрнэт-прасторы, у першую чаргу ў сацыяльных сетках, спажыўцамі кантэнту якіх з'яўляецца моладзь.** «У апошні час яны сталі актыўным інструментам навязвання псеўдаэкспертных меркаванняў, фарміравання лжывых ацэнак, і нам трэба актыўна працаваць на гэтай пляцоўцы, фарміраваць аб'ектыўную інфармацыю аб тым, што адбываецца ў жыцці ўстановы адукацыі, у сістэме адукацыі і ў краіне ўвогуле. Калі некаторыя нашы педагогі не ведаюць, як працаваць у сацыяльных сетках, то задача АПА, Рэспубліканскага інстытута вышэйшай школы, РІПА, абласных інстытутаў развіцця адукацыі навучыць іх гэтаму», — падкрэсліў міністр.

Летась на базе БДПУ быў створаны Рэспубліканскі цэнтр аказання псіхалагічнай дапамогі, які працуе з навучэнцамі, іх бацькамі і педагогамі, у тым ліку ў анлайн-рэжыме. «На жаль, не ўсе школьныя псіхолагі ведаюць пра яго існаванне. Ствараючы рэспубліканскі цэнтр, мы разлічвалі на тое, што не толькі ўстановы адукацыі, але і абласныя, раённыя органы выканаўчай улады будуць зацікаўлены на месцах, — заўважыў Ігар Карпенка. — Лічым, што **трэба па-новаму пераасэнсаваць ролю псіхолага ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі.** Яны там цяпер знаходзяцца на другіх ролях і часта задзейнічаны для выканання другасных даручэнняў дырэктара. Таму міністэрствам **прапрацоўваецца пытанне аб пераглядзе структуры, зместу іх работы, карэкціроўкі функцыянальных абавязкаў і штатнай колькасці».**

Міністэрства адукацыі таксама плануе ўкараніць Этычны кодэкс педагога. Дакумент ужо распрацаваны і будзе апублікаваны для абмеркавання ў «Настаўніцкай газеце». Ігар Карпенка нагадаў пра ўплыў асобы педагога на фарміраванне асобы навучэнца і на адукацыйны працэс увогуле. «Я праціўнік любых формаў гвалту супраць дзіцяці, у тым ліку псіхалагічнага і моўнага», — кажа міністр адукацыі.



Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

**Першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Максім РЫЖАНКОЎ,** які прыняў удзел у калегіі Міністэрства адукацыі, звярнуў увагу на тое, што часам неграматныя метады выхаваўчай работы педагогаў становяцца здабыткам YouTube і кідаюць сур'ёзны цень на ўсю сістэму адукацыі. «Мяркую, што такія выпадкі былі і раней, але сучасныя тэхналогіі дазваляюць выцягваць іх з самых аддаленых куткоў, і схаваць падобныя факты, як гэта было раней, ужо не ўяўляецца магчымым», — падкрэсліў ён.

### Чаму «законы» адстаюць?

Шмат праблемных пытанняў узняў у сваім выступленні на калегіі Міністэрства адукацыі **намеснік прэм'ер-міністра Ігар ПЕТРЫШЭНКА.**

— Сёння ахоп дзяцей дашкольнай адукацыяй у сельскай мясцовасці складае 53,2 %, у той час як у гарадской мясцовасці гэты паказчык амаль удвая большы — 91,9 %. Між іншым, дашкольная адукацыя — гэта яшчэ і ранняе развіццё дзіцяці, падрыхтоўка яго да школы, — падкрэсліў віцэ-прэм'ер. — Ці не таму дзеці з сельскай мясцовасці дэманструюць ніжэйшыя вынікі ў вучэбнай дзейнасці? Для таго каб дзіцячыя садкі там працавалі і былі запатрабаваныя, трэба, каб моладзь прыязджала на вёску і замацоўвалася на рабочых месцах. А для гэтага неабходна будаваць для маладых жыллё, выдзяляць ім зямельныя ўчасткі. Кіраўніком дзяржавы адпаведныя задачы перад аблвыканкамамі ўжо пастаўлены.

Асобна Ігар Петрышэнка спыніўся на стане нарматыватворчай дзейнасці. «Амаль пяць гадоў ідзе работа над унясеннем змяненняў у Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб адукацыі. Мы ўжо рэалізуем на практыцы многія інавацыі, якія да сённяшняга дня нарматыўна не замацаваныя. Сучасныя сродкі камунікацыі даўно прысутнічаюць у нашым жыцці, а мы толькі цяпер робім спробы ўрэгуляваць іх выкарыстанне ў вучэбным працэсе. Не наблізіліся мы і да сеткавай формы арганізацыі навучання. Рыхтуючы нарматыўныя акты, трэба працаваць на перспектыву, а не толькі замацоўваць тое, што ўжо рэалізуецца на практыцы, — падкрэсліў ён. — Працуючы над гэтымі дакументамі, трэба дэталёва прагназаваць наступствы іх рэалізацыі, не дапускаючы сацыяльнай несправядлівасці і ўшчамлення інтарэсаў асобных катэгорый насельніцтва. Прывяду прыклад. У нас вызначаны катэгорыі асоб, якім даюцца льготы пры аплаце харчавання дзяцей ва ўстановах дашкольнай адукацыі. Калі дзіцячы сад наведваюць двое дзяцей з адной сям'і, пры гэтым адзін з іх інвалід, то бацькі не плацяць за харчаванне дзіцяці-інваліда, а за другое плацяць 70 % ад кошту харчавання. Але калі дзіця-інвалід па стане здароўя не можа наведваць дашкольную ўстанову і знаходзіцца дома, то за харчаванне другога дзіцяці бацькі ўжо павінны плаціць 100 %. Дзе тут логіка? І ў першым, і ў другім выпадку становішча сям'і адно і тое ж...»

Віцэ-прем'ер даручыў Міністэрству адукацыі правесці рэвізію нарматыўнай базы, якая датычыцца прадастаўлення льгот, бо падобных фактаў быць не павінна. І другі прыклад. На прабелы ў нарматыўным рэгуляванні правядзення рэспубліканскіх алімпіяд для школьнікаў указалі самі ўдзельнікі алімпіяды. «І толькі пасля гэтага міністэрствам былі ўнесены змяненні ў правілы іх правядзення. Атрымліваецца, што органы кіравання адукацыяй не бачаць яўных прабелаў у нарматыўных дакументах і не ініцыююць іх карэкціроўку?» — задаў пытанне Ігар Петрышэнка і дадаў, што кожны нарматыўны дакумент павінен праходзіць грамадскае абмеркаванне, старанна вывярацца і аналізавацца.

Яшчэ адна актуальная тэма — правядзенне прафарыентацыйнай работы з выпускнікамі. Як і ў папярэднія гады, захоўваецца кан'юнктурны попыт на эканамічныя, юрыдычныя і IT-спецыяльнасці і ўвогуле на вышэйшую адукацыю. «Пагадзіцеся, што не ўсе могуць быць праграмістамі і эканамістамі. Наша задача — дапамагчы зрабіць асэнсаваны выбар будучай прафесіі, і гэта не абавязкова павінна быць вышэйшая адукацыя, — разважае Ігар Петрышэнка. — Разам з тым на атрыманне вышэйшай адукацыі мы самі арыентуем выпускнікоў — нашай жа сістэмай арганізацыі прыёмнай кампаніі. Бо спачатку дакументы прымаюць ВНУ, потым ідуць сярэднія спецыяльная навучальныя ўстановы і ўжо па рэштковым прынцыпе камплектуюцца ўстановы прафесійна-тэхнічнай адукацыі. Вось вам і ўся прафарыентацыя. Ці не адсюль такая колькасць адлічаных студэнтаў? За мінулы год па прычыне непаспяховасці з вышэйшых устаноў адукацыі было адлічана амаль восем тысяч чалавек, **а многія з іх маглі б навучацца ў сярэдніх спецыяльных ці прафесійна-тэхнічных навучальных установах і не марнаваць час і грошы, пры чым не толькі бацькоўскія, але і бюджэтныя.**

Лічу, што Міністэрства адукацыі павінна падумаць над гэтым. Мяркую, што **старт прыёмнай кампаніі можа быць дадзены адначасова для ўсіх устаноў прафесійнай адукацыі, а вось тэрміны завяршэння прыёму дакументаў могуць і павінны быць розныя.** Магчыма, многія абітурыенты, рэальна ацаніўшы свае веды і сілы, яшчэ на этапе падачы дакументаў зробяць правільны для сябе выбар. Нельга дапусціць абясцэньвання вышэйшай адукацыі, калі ў ВНУ прыходзяць не па веды, а па дыплом. Такія спецыялісты не будуць запатрабаваныя і не знойдуць сабе прымяненне. Прабачце, але прадаўцоў з вышэйшай адукацыяй на рынках і ў крамах у нас ужо дастаткова».

— Многія негатыўныя рэзанансныя здарэнні, якія адбыліся ў сістэме адукацыі летась, — гэта вынік безадказнасці, бескантрольнасці і халатнасці з боку кіраўнікоў усіх узроўняў сістэмы адукацыі, — лічыць віцэ-прэм'ер. — Яны прымусілі паглядзець па-новаму на сістэму бяспекі, прыняць больш сур'ёзныя меры па навядзенні дысцыпліны і парадку ва ўстановах адукацыі. Сёння па даручэнні кіраўніка дзяржавы створана міжведамасная камісія па праверцы ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі. **Здавалася б, пасля ўсіх даручэнняў і задач, якія ставіліся, у нас у школах павінен быць ужо ідэальны парадак. Але, як паказвае маніторынг, да ідэалу яшчэ вельмі далёка...**

Таксама Ігар Петрышэнка акцэнтаваў увагу на недапушчальнасць неабгрунтаваных платных паслуг. Ён згадаў каледж у Гомелі, дзе навучэнцам фактычна навязвалася рэпетытарства па вучэбных прадметах. «Такіх платных паслуг быць не павінна», — падкрэсліў ён. — Разам з тым дадатковыя заняткі, накіраваныя на развіццё дзяцей, якія пашыраюць сферы іх прафесійных інтарэсаў, могуць і павінны быць», — адзначыў Ігар Петрышэнка. Паводле яго слоў, установы адукацыі абавязаны зарабляць, што дазваляе ўмацоўваць іх матэрыяльна-тэхнічную базу і павялічваць зарплаты супрацоўнікаў. Але платныя заняткі павінны быць толькі на добраахвотнай аснове са згоды навучэнцаў і іх законных прадстаўнікоў.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

# Святыні, што нас аб'ядноўваюць

## БІЯГРАФІЯ З КАРЦІНКАМІ

Матэрыял для кнігі, што вырасла з некалькіх папярэдніх брашур, давялося збіраць з 2015-га да канца 2017 года літаральна па драбінках — у архівах, у багаслоўскіх трактатах папярэднікаў, ва ўспамінах відавочцаў тых ці іншых падзей. А таксама ва ўласнай памяці, бо ігумення Гаўрыіла сама вырасла ў Жыровіцах. І, як яна жартуе, у 1963 годзе нават стала самай юнай навучэнкай духоўнай семінарыі — прыблізна ў чатыры гады слухала лекцыю аднаго з выкладчыкаў, седзячы пад партай, а ў 12-гадовым узросце, у час, калі манастыр зачынілі «на каранцін», умудрылася зладзіць падкоп пад агароджай, каб ахвотныя маглі трапіць на багаслужэнні.

Хапае ў кнізе і іншых цікавых, малавядомых ці зусім невядомых шырокай публіцы фактаў і сведчанняў — не толькі пра вяртанне цудадзейнага абраза з Масквы ў Жыровіцы ў слоіку з варэннем, але і пра тое, што ніводны з 22 снарадаў, выпушчаных падчас баёў за Жыровіцы па званіцы Крыжаўздвіжанскага храма, не прычыніў шкоды манастырскім будынкам, а пасля вызвалення мястэчка чырвонаармейцы наведалі малебен і атрымалі адмысловае благаславенне «біць далей супастата»; як у 1970-я напярэдадні закрыцця духоўная семінарыя суседнічала з сельгастэхнікумам, а ў брацкім корпусе размясцілі неўралагічную бальніцу... «Мая кніга — не для філасофаў і багасловаў, не для тых, хто прагне палемікі, навуковых дыскусій, яна для нас, простых людзей, і я хацела ўкласці ў яе частку сваёй любові да абіцелі, частку сэрца і ўдзячнасці да тых, з кім побач я жыла шмат гадоў», — падкрэслівае ігумення Гаўрыіла.

З фотаілюстрацыямі дапамог фатограф БелТА Леанід Шчаглоў, які прапанаваў шмат здымкаў з уласнага фотаархіва, для таго каб выбраць найлепшыя манастырскія віды.

Кніга, якая летась атрымала благаславенне свайго першага чытача — Мітрапаліта Філарэта, выйшла ў свет у 2019 годзе. Неўзабаве тэкст выдання ў электронным фармаце будзе размешчаны на сайце Жыровіцкага манастыра і партале Беларускай Праваслаўнай царквы. У друкаваным жа выглядзе кніга існуе ў трох варыянтах: у мяккім пераплёце (гэты варыянт ужо можна набыць ва ўсіх іконных лаўках Жыровіцкага манастыра), у цвёрдым — для бібліятэк і навучальных устаноў, і так званы VIP-варыянт у скураным пераплёце — для памятных падарункаў. Адзін з іх, напрыклад, будзе ўручаны Патрыярху Маскоўскаму Кірылу, які наведае юбілейныя ўрачыстасці непасрэдна ў Жыровіцах, другі абавязкова падорань Прэзідэнту Беларусі Аляксандру Лукашэнку — тым больш выданне ўключае рэдкія здымкі 1996 года, калі кіраўнік дзяржавы ўпершыню наведаў абіцель разам з Мітрапалітам Філарэтам і пакінуў запіс у кнізе ганаровых наведвальнікаў.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*



## НАМОЛЕНАЕ МЕСЦА

Наконт часу заснавання Свята-Успенскага манастыра ў грамадстве ішлі, дый сёння яшчэ ўздымаюцца спрэчкі, бо дакладная дата не зафіксавана ў пісьмовых крыніцах. Але гэта цалкам зразумела, тлумачыць прафесар кафедры царкоўнай гісторыі Мінскай духоўнай акадэміі Валянціна Цяплова: «Прасачыць гісторыю ўзнікнення манастыра і дакладна вызначыць дату можна з вялікай цяжкасцю, бо вялікая кніжная і дакументальная спадчына, якая захоўвалася ў беларускіх праваслаўных манастырах, калі тыя «перайшлі на унію», трапіла ў чужыя рукі і многія летапісы былі наўпрост знішчаны. Але са знойдзеных справаводчых дакументаў зразумела, што ў XVI стагоддзі манастыр ужо існаваў, і на іх падставе мы вызначылі найбольш імавернай датай яго заснавання 1520 год».

Цяпер у манастыры, расказвае архіепіскап Мінскі і Слонімскі Гурый, рэктар мінскай духоўнай семінарыі і намеснік Жыровіцкага манастыра, пражывае каля 40 насельнікаў-братоў і каля 30 кандыдатаў у манахі; у семінарыі больш за 120 чалавек вучыцца на пастырскім аддзяленні і аддзяленні мастацтваў, а з улікам завочнікаў колькасць студэнтаў духоўнай школы перавышае 400 чалавек. І ўсе яны з радасным хваляваннем рыхтуюцца прыняць шматлікіх паломнікаў і гасцей на святочных мерапрыемствах, кульмінацыя якіх адбудзецца 20 мая — менавіта ў гэты дзень ушаноўваецца ікона Жыровіцкай Божай Маці, якая аб'ядноўвае прадстаўнікоў розных канфесій, бо прызнаная цудадзейнай і праваслаўнымі, і каталікамі.

Але да мая яшчэ шмат часу, і ў Жыровіцах поўным ходам працягваюцца падрыхтоўчыя работы. Падтрымка з боку мясцовых і рэспубліканскіх улад відавочная, адзначаюць насельнікі Жыровіцкага манастыра: «Мы бачым, як аднаўляецца будынак брацкага корпуса, якія маштабныя работы праходзяць на тэрыторыі аграгарадка, — наогул такога хараства, як мы бачым цяпер, абіцель за часы свайго існавання яшчэ не перажывала...»

Паралельна з рэстаўрацыяй у Жыровіцах працягваюць прымаць паломнікаў і турыстаў, расказваюць экскурсантам пра гісторыю заснавання манастыра падскарбіем пры двары Вялікага Княства Літоўскага Аляксандрам Солтанам, пра ўнікальную архітэктуру ўсіх сямі цэркваў, якія ўваходзяць у манастырскі комплекс, запрашаюць пакаштаваць чыстай і, як лічыцца, гаючай вады з мясцовых святых крыніц, дэманструюць каштоўнасці царкоўна-археалагічнага музея і паказваюць заалагічны «Эдэмскі сад» на тэрыторыі так званых Старых Жыровіц, дзе да 1942 года знаходзілася родавая сядзіба Солтанаў — яе знішчылі падчас Вялікай Айчыннай вайны, каб выкурыць ворага, ды так і не аднавілі. З 2010-га гэтую тэрыторыю займае манастырскі падворак. Цяпер тут зноў пладаносіць расчышчаны манахамі і месцічамі яблыневы сад, пакрысе зарыбляюцца сажалкі. А яшчэ мірна суіснуюць побач звяры — мядзведзь, ваўкі, яноты, лісы, коні, козы, алені, нутрыі, шматлікія птушкі і нават экзатычныя сурыкаты — і людзі. У прыватнасці, частыя госці тут — дзеці з сацыяльнага прытулку ў Слоніме і дарослыя, якія праходзяць рэабілітацыю ад залежнасці ў цэнтры «Анастазіс».

## КУЛЬТУРНЫ ПЛАСТ

Цягам 2020 года ўбачаць свет яшчэ тры кнігі, якія рыхтуе выдавецтва «Беларуская энцыклапедыя імя Петруся Броўкі», аб'яднаныя праваслаўнай тэматыкай. «Яны не толькі датычацца сферы рэлігіі, але і ўздымаюць вельмі моцны культурны, філасофскі пласт, закранаючы такія паняцці, як дабро і зло, свабода, справядлівасць, шчасце, каштоўнасць чалавечага жыцця, — кажа кіраўнік выдавецтва Вольга Ваніна. — Гэта рэфлексія ў сучаснасці, развагі аб тым, як мы жывём, што робім, і разам з тым погляд у будучыню: што будзе заўтра».

Адна з кніг выйдзе прыкладна ў красавіку-маі бягучага года і расказвае акурат пра Жыровіцкі манастыр. Гэта навукова-даведачная энцыклапедыя «Жыровічы» тыражом 1000 асобнікаў, над якой працуюць сумесна прадстаўнікі Беларускай праваслаўнай царквы, Мінскай духоўнай семінарыі і духоўнай акадэміі, а таксама шэраг свецкіх спецыялістаў: гісторыкаў, даследчыкаў, рэдактараў. Выданне ўключае каля 200 багата ілюстраваных артыкулаў, якія апавядуць не толькі пра гісторыю ўласна манастыра і цудадзейнай іконы, але і пра вядомых ураджэнцаў Жыровіц, і пра творчых людзей, якія прысвяцілі свае творы гэтым мясцінам. У працэсе падрыхтоўкі энцыклапедыі, расказваюць супрацоўнікі выдавецтва, было зроблена цікавае адкрыццё: аказваецца, у канцы XVI стагоддзя існавала так званая «Жыровіцкая энцыклапедыя» — на думку некаторых даследчыкаў, наогул першае энцыклапедычнае выданне на тэрыторыі Беларусі, якое ўяўляла сабой збор артыкулаў пра гісторыю, сучасны стан дзяржавы, славутых дзеячаў і г. д.

Другая кніга — альбом «Храм-помнік зямлі Белай Русі», які ўтрымлівае амаль паўтысячы ілюстрацый, — убачыць свет да 75-годдзя Перамогі і ўсебакова расказа пра храм у імя Усіх Святых у Мінску: як амаль дваццаць гадоў таму пры яго будаўніцтве спалучыліся гістарычная спадчына і сучасныя тэхналогіі, як аздабляліся крыпта і прыдзелы, з якіх частак комплекс складаецца сёння і якія задачы выконвае. Працягне серыю навукова-папулярнае выданне «І Маці Божай памалюся» Міхася Карпечанкі, прысвечанае вядомай з 1623 года Бялыніцкай іконе Божай маці (на жаль, падчас Вялікай Айчыннай вайны цудадзейны абраз знік, і дагэтуль яго месцазнаходжанне не ўстаноўлена, копіі ж, датаваныя сярэдзінай XVII стагоддзя, захоўваюцца ў музеі старабеларускай культуры НАН Беларусі і ў некаторых храмах Беларусі і Літвы) і гісторыі саміх Бялыніч — ад невялікага мястэчка да горада раённага падпарадкавання.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

**Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.**

*Жыровіцы — Мінск.*

Наш фармат

## КАРЦІНКІ З ВЫСТАЎКІ

**Пятніца на 27-й Мінскай міжнароднай кніжнай выстаўцы-кірмашы выдалася насычаная. На нацыянальным стэндзе прайшлі прэзентацыі кніг «Традыцыі суверэннай Беларусі», «Багуслаў Радзівіл. Генерал караля», «Смак беларускай кухні», серыі «Мір вачыма этнолага» і іншых, тут прадставілі інфармацыйна-ілюстрацыйны праект «Лясная песня», а таксама зборнік паэзіі і прозы сучасных беларускіх аўтараў «Мая Радзіма» і фотапраект Вячаслава Цыдзіка «Бачу Беларусь такой». Старт маштабнага праекта «Вайна і мір», прымеркаванага да 75-годдзя Вялікай Перамогі, анансаваў вядомы гісторык, калекцыянер Уладзімір Ліхадзедаў.**





Нон-стопам ішлі прэзентацыі, квэсты і гульні на дзіцячай пляцоўцы, дзе бацькі і дзеці за дзень маглі пазнаёміцца з аўтарамі вершы добрага дзясятка кніг. На расійскім стэндзе чыталі вершы малады паэтаў, праводзілі адкрыты турнір па настольнай гульні «Кнігаполія Аквілегіі», гаварылі пра перспектывы супрацоўніцтва Расіі і Беларусі ў галіне распаўсюджвання друкаваных СМІ і прадстаўлялі сумесныя выдавецкія праекты, прэзентавалі кніжныя навінкі да беларускіх пісьменнікаў Ганны Севярынец, Андрэя Жвалеўскага і Яўгеніі Пастэрнак, а беларускія аўтары платформы «ЛітРэс: Самвыдат» абмяркоўвалі тэму публікацыі кніг без выдаўцоў. Цэнтральны экспанент сёлетняй выстаўкі ЗША ладзіў інтэрактыўныя праекты для моладзі, прапаноўваў цікавыя турыстычныя маршруты і расказваў гісторыю амерыканскага плаката XX стагоддзя. У кнігарні «Дружба» прайшлі сустрэчы з украінскімі пісьменнікамі і прэзентавалі паэтычную анталогію сучаснай азербайджанскай літаратуры, якая ўбачыла свет у Выдавецкім доме «Звязда». У Дзяржаўным музеі гісторыі беларускай літаратуры атрымалі ў падарунак унікальнае выданне рамана Васіля Быкава «Мёртвым не баліць», якое ў 1960-х апублікавала ўкраінская дыяспара ў Нью-Ёрку.

Увечары ж у Нацыянальным выставачным цэнтры «БелЭкспа» адбылася ўрачыстая цырымонія ўзнагароджання пераможцаў нацыянальнага конкурсу «Мастацтва кнігі». Больш падрабязна пра гэта «Звязда» раскажа ў наступным нумары. А сёння і заўтра гасцей і ўдзельнікаў ММКВК чакае яшчэ мноства цікавых падзей — сустрэч, прэзентацый, аўтограф-сесій і знаёмстваў з новымі кнігамі і іх аўтарамі.

**Вікторыя ЗАХАРАВА.**

**Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.**

## Информационное сообщение о проведении аукциона по продаже гражданам Республики Беларусь в частную собственность земельных участков для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов в дер. Рудомейка, дер. Малое Залужье, дер. Дуброва, ул. Магистральная, дер. Прилепская Усяжка, Озерицко-Слободского сельсовета, Смолевичского района, Минской области

| | | |
|---|---|---|
| 1 | **Форма проведения аукциона** | Открытый |
| 2 | **Дата, время и место проведения аукциона** | 19 марта 2020 года, в 15.00, аг. Слобода, ул. Красногвардейская, 27, Озерицко-Слободской сельисполком, зал заседаний |
| 3 | **Продавец и его адрес** | Озерицко-Слободской сельисполком, аг. Слобода, ул. Красногвардейская, 27 |
| 4 | **Земельный участок, его кадастровый номер и адрес** | Лот № 1 – площадь 0,1388 га, № 624883008601000095, дер. Рудомейка;<br>лот № 2 – площадь 0,1498 га, № 624883006601000137, дер. Малое Залужье;<br>лот № 3 – площадь 0,0908 га, № 624883003801000327, дер. Дуброва, ул. Магистральная;<br>лот № 4 – площадь 0,1098 га, № 624883008201000112, дер. Прилепская Усяжка |
| 5 | **Условия продажи** | Без изменения целевого назначения |
| 6 | **Целевое назначение земельного участка** | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (10904 земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома) |
| 7 | **Начальная (стартовая) цена продажи** | Лот № 1 – 15000 руб.;<br>лот № 2 – 10000 руб.;<br>лот № 3 – 15 000 руб.;<br>лот № 4 – 12000 руб. |
| 8 | **Условия аукциона** | а) продажа по цене не ниже начальной;<br>б) участниками аукциона могут быть граждане Республики Беларусь, постоянно проживающие на территории республики;<br>в) без права предоставления рассрочки;<br>г) возместить затраты на строительство, в том числе проектирование, объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры к земельному участку в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 7 февраля 2006 г. № 72 «О мерах по государственному регулированию отношений при размещении и организации строительства жилых домов, объектов инженерной, транспортной и социальной инфраструктуры» в размерах, определенных решением Смолевичского райисполкома;<br>д) при подаче заявления на определенный лот только одним участником земельный участок продается по начальной цене, увеличенной на 5 %;<br>е) наличие не менее двух участников |
| 9 | **Наличие инженерной инфраструктуры** | дер. Рудомейка – подъездные пути, электроснабжение, газоснабжение;<br>дер. Малое Залужье – подъездные пути, электроснабжение;<br>дер. Дуброва, ул. Магистральная – подъездные пути, электроснабжение;<br>дер. Прилепская Усяжка – подъездные пути, электроснабжение |
| 10 | **Ограничения в использовании** | Лот 2 – водоохранная зона реки Бараневка (площадь 0,1498 га);<br>лот 3 – водоохранная зона Дубровского водохранилища (площадь 0,0908 га) |
| 11 | **Условия оплаты** | За безналичный расчет в течение 10 рабочих дней после подписания протокола по результатам проведения аукциона |
| 12 | **Сумма задатка и реквизиты продавца** | 10 % от начальной (стартовой) цены земельного участка, р/с BY50AKBB36410000006146200000 БИК AKBBBY2X ОАО «АСБ Беларусбанк» ЦБУ 621 г. Смолевичи, УНП 600046563 (с пометкой «задаток за земельный участок») |
| 13 | **Порядок предварит. ознак. в натуре с земельным уч.** | Среда в 10.00 |
| 14 | **Начало приема документов** | С 19 февраля 2020 г. в рабочие дни: понедельник, вторник, среда, четверг, пятница с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 |
| 14 | **Окончательный срок приема документов** | 13 марта 2020 года в 17.00 |
| 15 | **Контактные телефоны** | 8-01776-29-395, 68-030 |

Расходы по организации и проведению аукциона: лот 1 – 1850,61 руб., лот 2 – 1689,41 руб., лот 3 – 1894,51 руб., лот 4 – 1817,24 руб. и публикация информационного сообщения подлежат возмещению победителем аукциона.

Примечания: для участия в аукционе в адрес продавца необходимо представить:

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме.
2. Копии платежных поручений, заверенные банком, подтверждающие внесение суммы задатка (задатков) на расчетный счет продавца.

Физическим лицам – документ, удостоверяющий личность (паспорт), и копию паспорта покупателя или его доверенного лица и доверенность, заверенную нотариально (в случае если интересы покупателя представляет это лицо).

3.Счет в банке, на который перечисляется сумма возвращаемого задатка.

## Острошицкий сельский исполнительный комитет (организатор аукциона) извещает о проведении 10 марта 2020 года открытого аукциона по продаже земельных участков в частную собственность граждан Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов

| № лота | Адрес земельного участка, кадастровый номер | Площадь (га) | Ограничения в использовании, инфраструктура | Начальная цена (бел. руб.) | Размер задатка (бел. руб.) | Расходы по изготовлению документации (бел. руб.) |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | д. Ребрище, У-1, кадастровый номер 623286307601000079 | 0,1461 | Черта населенного пункта. Имеются сети: электрификация, водоснабжение | 5000,00 | 500,00 | 1871,74 + расходы за размещение объявления |
| 2 | д. Панышевщина, ул. Весенняя, 21, кадастровый номер 623286307101000093 | 0,0947 | Черта населенного пункта. Имеются сети: электрификация, газоснабжение | 6000,00 | 600,00 | 1971,38 + расходы за размещение объявления |

**Дата, время и место проведения аукциона**: 10 марта 2020 в 10.00 по адресу: Логойский район, аг. Острошицы, ул. Центральная, д. 8, Острошицкий сельский исполнительный комитет, контактные телефоны**: 8 (01774) 57 6 21, 57 6 35, 57 6 36; (+37529) 366 76 48.**

**Прием документов, ознакомление с участком и документацией:** ежедневно с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (кроме субботы и воскресенья) по 04.03.2020 включительно.

**Для участия в аукционе необходимо:**

1. подать заявление об участии в аукционе в комиссию по организации и проведении аукционов;
2. предоставить квитанцию об уплате суммы задатка;
3. предоставить паспорт и копию его страниц, содержащих идентификационные сведения, либо нотариально удостоверенную доверенность;

заключить соглашение с местным исполнительным комитетом.

Всем желающим предоставляется возможность ознакомиться с документацией и с земельными участками, выставляемыми на аукцион. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения.

**Задаток** перечисляется на расчетный счет BY37AKBB36006191411050000000 в ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY2X, УНН 600537220, код платежа 04901, получатель – Острошицкий сельский исполнительный комитет.

**Условия:** аукцион проводится при наличии двух и более участников. Победитель аукциона обязан в течение 10 рабочих дней после подписания протокола о результатах проведения аукциона внести плату за земельный участок и возместить расходы, связанные с организацией и проведением аукциона.

Затраты на строительство, в том числе проектирование объектов распределительной, инженерной и транспортной инфраструктуры к земельному участку, подлежат возмещению в порядке и случаях, предусмотренных постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 01.04.2014 № 298 «Об утверждении Положения о порядке возмещения лицом, которому предоставлен земельный участок, затрат на строительство, в том числе проектирование, объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры к такому земельному участку», в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 07.02.2006 № 72 «О мерах по государственному регулированию отношений при размещении и организации строительства жилых домов, объектов инженерной, транспортной и социальной инфраструктуры».

## РУП «Институт недвижимости и оценки» (Организатор аукциона) извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже продовольственной базы ОАО «ДОРОРС» (Продавец)

**Лот № 1, состав**: 1. Здание склада (картофелехранилище), инв. № 240/С-44721. Площадь – 494,6 кв. м. 2. Здание склада (фруктохранилище), инв. № 240/С-45933. Площадь – 64,4 кв. м. 3. Здание склада овощехранилища, инв. № 240/С-44734. Площадь – 1272,6 кв. м. 4. Здание тарного склада, инв. № 240/С-44724. Площадь – 313,1 кв. м. 5. Здание склада с теневым навесом, инв. № 240/С-44733. Площадь – 1422,1 кв. м. Адрес: г. Орша, ул. Щетинковская, 39/2, 39/4, 39, 39/3,39/7. Земельный участок: 1. Кадастровый номер 242400000001010845, площадь – 1,7485 га. Право постоянного пользования. 2. Кадастровый номер 223650100001015592, площадь – 0,1372 га. Право постоянного пользования. **Начальная цена с НДС – 143 265,98 бел. руб.** Задаток – 14 326,60 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.

Размер штрафа, предусмотренного соглашением о правах и обязанностях сторон в процессе организации и проведения аукциона составляет 10 000,00 бел. руб.

Аукцион состоится **24.02.2020 в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4.

Порядок оформления участия в аукционе, условия участия в аукционе, срок заключения договора купли-продажи, условия оплаты, а также полный текст извещения содержатся на сайте Организатора аукциона ino.by. Задаток перечисляется на р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе 24.02.2020. Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.00 и с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 7. Окончание приема заявлений – 20.02.2020 в 11.00. Первое полное извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 22.05.2019 г.

**☎ Организатор аукциона: 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

## РУП «Институт недвижимости и оценки» (Организатор аукциона) извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества ОАО «ДОРОРС» (Продавец)

**Лот № 1, состав**: 1. Здание магазина № 61, инв. № 240/С-45976. Площадь – 115,9 кв. м, г. п. – 1973. 2. Здание склада, инв. № 084792. Площадь – 22,0 кв. м. Адрес: Витебская обл., Оршанский р-н, Межевский с/с, аг. Заполье, ул. Станционная, 2, 2/1 (соответственно). Земельный участок: кадастровый номер 223684400001000005, площадь – 0,0370 га. Право постоянного пользования. Начальная цена с НДС – **10 047,88 бел. руб.** Задаток – **1004,80 бел. руб.** Шаг аукциона – 5 %.

Размер штрафа, предусмотренного соглашением о правах и обязанностях сторон в процессе организации и проведения аукциона, составляет 2000,00 бел. руб.

**Аукцион состоится 21.02.2020 в 09.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4**

Порядок оформления участия в аукционе, условия участия в аукционе, срок заключения договора купли-продажи, условия оплаты, а также полный текст извещения содержатся на сайте Организатора аукциона ino.by. Задаток перечисляется на р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, BIC BPSBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе 21.02.2020. Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.00 и с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 7. Окончание приема заявлений – 19.02.2020 в 11.00. Первое полное извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 24.05.2019 г.

**☎ Организатор аукциона: 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ УП «Могилевское отделение БелТПП» 12 марта 2020 в 14.00 проводит торги по продаже следующего объекта

**Лот № 1:** изолированное помещение с инвентарным номером 700/D-119033 (назначение – квартира; наименование – квартира № 31), площадью 65,7 кв. м, расположенное по адресу: Могилевская обл., г. Могилев, пр-т Мира, д. 25-Г, кв. 31.

**Начальная цена продажи** без учета НДС (освобождение от НДС согл. ст. 118 п. 1.33 НКРБ): 106 300,00 (сто шесть тысяч триста белорусских рублей 00 копеек), задаток – 10 630,00 (десять тысяч шестьсот тридцать белорусских рублей 00 копеек).

**Собственник имущества:** открытое акционерное общество «Трест Белсантехмонтаж № 1», г. Минск, ул. Якуба Коласа 23, к. 1 (тел. для осмотра объекта торгов 80293427148).

**Организатор торгов:** унитарное предприятие по оказанию услуг «Могилевское отделение Белорусской торгово-промышленной палаты», г. Могилев, ул. Циолковского, 1, сайт: www.mogilevcci.by.

**Место проведения торгов:** г. Могилев, ул. Циолковского, 1, каб. 203.

Лот № 1 продается без условий на торгах в форме открытого аукциона с применением метода повышения начальной цены, с шагом 5 (пять) процентов от предыдущей названной аукционистом цены. Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору торгов в сроки, указанные в извещении, следующие документы: заявление на участие в торгах; копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); доверенность представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения торгов; соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения торгов (в двух экземплярах); копию платежного поручения о внесении задатка, заверенную банком. Задаток перечисляется на расчетный счет УП «Могилевское отделение БелТПП» р/с № BY55PJCB30123018571000000933 в «Приорбанк» ОАО, ЦБУ 300 г. Могилев, BIC: PJCBBY2X, УНП 700016628; физическим лицам – предъявить паспорт; иные документы в соответствии с Положением о порядке организации и проведения торгов по продаже объектов, находящихся в собственности юридических лиц и индивидуальных предпринимателей Республики Беларусь, организуемых УП «Могилевское отделение Белорусской торгово-промышленной палаты».

Условия регистрации, участия в торгах размещены на интернет-сайте продавца по адресу: www.mogilevcci.by.

**Срок заключения договора купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем)** – в течение 10 календарных дней после проведения торгов.

Торги состоятся 12 марта 2020 г. в 14.00 по адресу: г. Могилев, ул. Циолковского, 1, каб. 203, УП «Могилевское отделение БелТПП».

Срок подачи заявления: с момента выхода публикации настоящего извещения в рабочие дни с 9.00 до 12.00 и с 14.00 до 15.00 по адресу: г. Могилев, ул. Циолковского, 1, к. 104. Последний срок подачи заявления – 11 марта 2020 до 12.00.

Регистрация участников торгов 12 марта 2020 с 13.00 до 14.00 по адресу: г. Могилев, ул. Циолковского, 1, каб. 203.

Телефоны для справок: (0222) 778042, +375 033 6276659 (МТС), + 375 0296927492 (Velcom).

Дополнительная информация размещена на сайте организатора в разделе «торги» по адресу: **www.mogilevcci.by**

## РУП «Институт недвижимости и оценки» (организатор аукциона) извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДОРОРС» (продавец)

**Лот № 1:** здание магазина № 5, инв. № 240/С-32270. Площадь – 306,4 кв. м, г. п. – 1948. Адрес: г. Орша, ул. Деповская. 2. Обременение: аренда части здания (136,6 кв. м) до 30.12.2020. Земельный участок: кадастровый номер 242400000003000879, площадь – 0,0496 га. Право постоянного пользования. Начальная цена с НДС – **8265,84 бел. руб.** Задаток – **826,58 бел. руб.** Шаг аукциона – 5 %.

Размер штрафа, предусмотренного соглашением о правах и обязанностях сторон в процессе организации и проведения аукциона, составляет 2000,00 бел. руб.

Аукцион состоится **24.02.2020** в **09.00** по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4.

Порядок оформления участия в аукционе, условия участия в аукционе, срок заключения договора купли-продажи, условия оплаты, а также полный текст извещения содержатся на сайте Организатора аукциона ino.by. Задаток перечисляется на р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе **24.02.2020**. Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.00 и с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 7. Окончание приема заявлений – **20.02.2020** в 11.00. Первое полное извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 28.02.2019 г.

**☎ Организатор аукциона: 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

## Извещение о проведении открытого аукциона на право заключения договора аренды земельного участка в г. Кировске 9 марта 2020 года. Аукцион состоится 9 марта 2020 года в 10.00 по адресу: г. Кировск, ул. Кирова, 80, 2-й этаж, кабинет 34

| № лота | Адрес земельного участка | Площадь, га | Срок аренды | Целевое назначение земельного участка (назначение в соответствии с единой классификацией) | Кадастровый номер | Стоимость документации (руб.) | Начальная цена (руб.) | Сумма задатка (руб.) |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| № 1 | Севернее деревни Грибова Слобода Кировского района Могилевской области | 3,0 | 25 лет | Для размещения здания стрелкового комплекса | 722500000001001655 | 4285, 86 | 804,38 | 160,88 |

**Принимать участие в аукционе имеют право граждане, индивидуальные предприниматели и юридические лица. Допускается участие на стороне покупателя консолидированных участников – двух и более граждан, индивидуальных предпринимателей, юридических лиц.**

При оформлении заявления и соглашения о правах, обязанностях и ответственности сторон желающими принять участие в аукционе представляются **паспорт**, а также следующие документы: документ, подтверждающий внесение **суммы задатка (задатков**) на расчетный счет главного управления Министерства финансов Республики Беларусь по Могилевской области № BY76AKBB36007170000180000000, г. Минск ОАО «АСБ Беларусбанк», код AKBBBY2X, УНП 700451296 (разовый платеж), **с отметкой банка**; **гражданином** – копия документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования; **представителем гражданина** – нотариально удостоверенная доверенность; **индивидуальным предпринимателем** – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования; **представителем индивидуального предпринимателя** – нотариально удостоверенная доверенность.

Беларусь і свет

# НАШ ЧАЛАВЕК У БАРСЕЛОНЕ

## Калі ў Іспаніі з'явяцца беларускія электробусы і чым гарады Каталоніі могуць прывабіць нашага турыста

**Беларускі сцяг у Іспанскім Каралеўстве ўпершыню быў узняты ў 2015 годзе на адным з будынкаў у горадзе Алікантэ, дзе размясцілася першае ганаровае консульства нашай краіны. Мінула фактычна тры гады і толькі тады беларускае пасольства, акрэдытаванае яшчэ ў 2016 годзе, атрымала свой офіс у Мадрыдзе. А з верасня 2018 года ў самабытнай, дзівоснай Барселоне на вуліцы Rambla de Catalunya можна знайсці яшчэ адзін куточак Беларусі ў Іспаніі. Там змяшчаецца офіс другога ганаровага консульства нашай краіны. Яго ўзначальвае Крысціян БАЛСЕЛС. Ганаровы консул — не зусім тыповая дыпламатычная пасада. Імі становяцца грамадзяне Беларусі або замежнікі, якія займаюць значнае грамадскае становішча ў пэўнай краіне.**



Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

З ганаровым консулам Беларусі ў Барселоне, уладальнікам юрыдычнай кампаніі, спадаром Крысціянам Балселсам карэспандэнт «Звязды» пазнаёмілася ў Мінску. Крысціян уваходзіў у склад іспанскай дэлегацыі, якая на мінулым тыдні наведала беларускую сталіцу. Узначальваў яе міністр транспарту і інфраструктуры Каталоніі Ісідрэ Гавін. Праграма візіту была досыць багатая: сустрэчы ў Банку развіцця, Нацыянальным цэнтры маркетынгу, Мінскбуду, музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, «Белавіа», на «Белкамунмашы» і ва ўрадзе. Нягледзячы на такі шчыльны графік, Крысціян Балселс знайшоў час для інтэрв'ю нашаму выданню.

***— Спадар Балселс, як да вас паступіла прапанова стаць ганаровым консулам?***

— Па прафесіі я адвакат, маю офіс у Барселоне, які спецыялізуецца на міграцыйным праве. У сувязі з маім вопытам у мяне было шмат кліентаў-беларусаў, якім мы садзейнічалі ў атрыманні віду на жыхарства ў Іспаніі. Дзякуючы гэтым кантактам мы пазнаёміліся з Паўлам Латушкам (у той час Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Беларусі ў Францыі, Каралеўстве Іспаніі і Партугальскай Рэспубліцы па сумяшчальніцтве). Ад яго атрымаў прапанову стаць ганаровым консулам вашай краіны, якая стала вельмі цікавай для мяне. Да прызначэння быў у Беларусі некалькі разоў па справах бізнесу.

***— Чым вас зацікавіла Беларусь?***

— Я быў зацікаўлены ў пасадзе, таму што спачатку гэта было своеасаблівай прыгодай. Мне вельмі падабаецца ваша краіна, здзіўляе гасціннасць, адкрытасць. Ды і размяшчэнне на карце свету мае стратэгічнае значэнне.

***— Адна з задач ганаровага консульства ў Барселоне на 2020 год — узмацненне адносін Беларусі з правінцыяй Лерыда. Чаму менавіта гэты рэгіён Каталоніі?***

— Мая сям'я, продкі родам з цэнтра правінцыі — горада Лерыда. Як сапраўдны лерыданец, я вельмі добра ведаю гэты край, і заўважыў шмат агульнага паміж ім і Беларуссю. На гэтых землях Іспаніі вельмі развіта сельская гаспадарка. Там вырошчваюць фрукты і гародніну фактычна на ўсю Каталонію.

***— Што Іспанія магла б імпартаваць з Беларусі?***

— Напрыклад, трактары. Іх вытворчасць — гэта слабае звяно ў Іспаніі. Такой прамысловасці ў нашай краіны няма, таму нам цікава кампанія кшталту МТЗ. У «Белкамунмаша» прадукцыя высокай якасці, якая магла б ісці на экспарт у маю краіну. Хутка будуемыя дамы з драўніны — галіна таксама развітая ў Беларусі, якой няма ў Іспаніі. Інтарэс да такой будоўлі праявілі ўрад Каталоніі і Агенцтва па канкурэнтаздольнасці. Гэтыя кантакты ўяўляюць цікавасць для будаўніцтва сацыяльнага жылля. У вас існуе буйны Парк высокіх тэхналогій, ёсць цікавыя распрацоўкі ў праграмах. Я ганаровы консул усяго год, і гэта тыя кірункі, пра якія паспеў даведацца за кароткі час. Але ўпэўнены: існуе яшчэ шмат разнастайнай прадукцыі, якая можа экспартавацца ў маю краіну.

***— Якія кірункі супрацоўніцтва паміж Беларуссю і Іспаніяй выйдуць на першы план у гэтым годзе?***

— На дадзены момант існуе пяць вектараў, якія б мы хацелі развіваць. Першы — пошук патэнцыйных партнёраў для сумеснага прадпрыемства ў Каталоніі з кампаніяй «Белкамунмаш». Другі — арганізацыя дэлегацыі кампаній ад харчовай прамысловасці ў Беларусь у канцы зімы — пачатку вясны. Наступны праект — па прадстаўленні Каталоніі на выстаўцы «Белагра» ў чэрвені. Ёсць магчымасць на гэтым мерапрыемстве ўпершыню Каталоніі стварыць асобны рэгіянальны стэнд з удзелам прыватных кампаній, іх прадукцыі. Плануецца, што суправаджаць прадпрымальнікаў будзе міністр сельскай гаспадаркі Каталоніі. У адказ мы б хацелі арганізаваць уласны стэнд Беларусі на выставе «Сан-Мігель». Гэта мерапрыемства, аналагічнае «Белагра», якое праходзіць у Лерыдзе. Але самы галоўны кірунак, каб іспанцы больш ведалі пра Беларусь, — прасоўванне турызму.

***— Як прайшлі перамовы з «Белкамунмашам»?***

— У нас ёсць план дзеяння ў двух этапах, якія ідуць паралельна. Адзін з іх — гэта пошук партнёра па стварэнні сумеснага прадпрыемства ў Каталоніі. У нашай дэлегацыі ўжо прысутнічаюць патэнцыйныя партнёры, буйныя транспартныя кампаніі з Каталоніі, якія б маглі заняцца гэтым праектам. Па-другое, ідзе працэс сертыфікацыі частак беларускіх электробусаў у Іспаніі, амалагацыі ўсёй дакументацыі. У гэтым годзе плануецца прывезці электробус для першапачатковых выпрабаванняў у Каталонію на пэўны эксплуатацыйны тэрмін. Кампаніі жадаюць паглядзець на тэхніку ў справе. Я са свайго боку гатовы садзейнічаць і дапамагаць у любым пытанні, каб гэты праект меў поспех.

***— Наколькі для Іспаніі актуальна тэматыка беражлівага стаўлення да прыроды?***

— Тэма выкарыстання аднаўляльных крыніц, экалагічных відаў транспарту вельмі актуальная. Перад уладамі востра стаіць праблема забруджвання паветра. На жаль, стварэнне электробусаў у нас не так развіта, як у вас. Менавіта таму нашу дэлегацыю суправаджаў міністр транспарту і інфраструктуры Каталоніі. Ён хацеў на ўласныя вочы пабачыць, як гэты транспарт функцыянуе ў Мінску, наведаць вытворчасць «Белкамунмаш».

***— Хто ўвойдзе ў дэлегацыю з прадстаўнікоў харчовай прамысловасці, якая ў хуткім часе прыедзе ў Мінск?***

— Яна будзе складацца з прыватных кампаній Каталоніі з розных сектараў — вытворчасць вінаў, шампанскага, кандытарскіх вырабаў, аліўкавага алею. На парадку дня будуць пытанні прамых паставак прадукцыі з Каталоніі ў Беларусь, перапрацоўкі яе на вашых прадпрыемствах. Акцэнт зробяць на разліве ў Беларусі алею, вінаў з магчымасцю рэалізацыі і на трэціх рынках.

***— Большасць беларусаў ведаюць курорты Каталоніі як пляжны адпачынак. Але вы рэкамендуеце рэгіён для спартыўнага турызму...***

— У гэтай частцы Іспаніі вельмі развітыя гарналыжныя курорты, якія могуць прапанаваць беларускаму турысту шырокі пакет паслуг. Мы правялі перамовы з генеральным дырэктарам кампаніі «Белавіа» аб магчымасці ўзімку арганізаваць прамы авіярэйс з Мінска ў Лерыду. — Для культурнага адпачынку прапаную старажытныя невялікія гарадкі, якія знаходзяцца пад абаронай ЮНЕСКА. І, вядома ж, у правінцыі Лерыда вельмі смачная ежа, напрыклад, знакамітыя смаўжы. Нам ёсць чым здзівіць вас.

***— Што іспанцы ведаюць пра Беларусь?***

— Калі шчыра, ведаюць вельмі мала. Таму мая работа заключаецца ў тым, каб даць больш інфармацыі пра Беларусь іспанцам. І дэлегацыі, якія мы прыводзім сюды, дапамагаюць у гэтым. Людзі больш даведваюцца пра вас, а потым перадаюць іншым, як усё выдатна прайшло.

***— Наколькі цяжка сумяшчаць адвакацкую дзейнасць і працаваць на пасадзе ганаровага консула?***

— Няцяжка, гэта вельмі цікава. Трэба атрымліваць асалоду ад жыцця і выкарыстоўваць кожную магчымасць спрабаваць нешта новае. Тое, што я раблю ад сябе, упэўнены: у будучым мне гэта вернецца абавязкова нечым добрым.

**Марыя ДАДАЛКА.**

Навацыі

# З мабільнікам ты «зайцам» не будзеш?

## Пры дапамозе сотавага тэлефона набыццё славутага талончыка — адно імгненне

**На гэтым тыдні стала даступнай тэхналогія продажу і праверкі квіткоў у грамадскім транспарце ў электронным выглядзе з дапамогай QR-кода. Кампанія LWO і адзін з сістэмных банкаў краіны рэалізавалі такую магчымасць у аўтатранспарце Барысава.**

Гаворка ідзе аб аплаце праезду праз мабільны дадатак «Аплаці ТМ». Гэта значыць, што набыць квіток цяпер можна непасрэдна ў салоне аўтобуса з дапамогай смартфона ўсяго ў адзін клік.

«Гэта якраз той прыклад, калі тэхналогіі, якія напрацоўваюцца ў фінансавым сектары, робяць больш даступнымі іншыя прадукты і паслугі, палягчаючы наша жыццё. Даная мабільная праграма з моманту свайго з'яўлення на рынку выходзіла за рамкі стандартнага фінансавага сэрвісу. Гэта цэлая экасістэма, якую стварае банк, і, што немалаважна, не толькі для сваіх кліентаў. Сэрвіс даступны любому жыхару краіны і дае магчымасць аплачваць тавары з дапамогай QR-кода, здзяйсняць плацяжы праз сістэму АРІП, пераводзіць грашовыя сродкі адно аднаму без камісіі незалежна ад таго, кліентам якога банка вы з'яўляецеся, — адзначыў **намеснік Старшыні Праўлення ААТ «Белінвестбанк» Андрэй САКІРКА.**

Купля білета адбываецца вельмі проста і хутка. У салоне аўтобуса размешчаны QR-коды для пакупкі электроннага білета на адну паездку. Пасажыру неабходна зайсці ў дадатак «Аплаці» і адсканіраваць QR-код. На форме пакупкі электроннага білета адлюструецца від транспарту і маршрут. Грамадзянін выбірае патрэбную колькасць білетаў і націскае «Аплаціць» або «Выхад». У выпадку паспяховай аплаты на экране тэлефона з'явіцца інфармацыйнае паведамленне аб купленым электронным білеце.

Што датычыцца праверкі білета кандуктарам, то пасажыр заходзіць у дадатак «Аплаці», сканіруе QR-код кандуктара. Калі ў яго ёсць электронны білет, то пасля праверкі на мабільніку адлюстроўваецца табельны нумар кандуктара, PIN-код, які яму выдаецца штодзень, апошнія чатыры лічбы нумара тэлефона пасажыра, у якога правяраецца білет, колькасць правераных кандуктарам білетаў за суткі.

— Мы імкнуліся распрацаваць такое рашэнне, каб пры мінімальных часовых і фінансавых затратах арганізаваць продаж білетаў у грамадскім транспарце. Гэта проста, хутка і бяспечна. Не трэба мець справу з наяўнымі грашыма і кандуктару, працэс робіцца больш просты, — растлумачыў **дырэктар кампаніі LWO Алег КАНДРАЦЕНКА.**

Барысаў стаў першым горадам, дзе ўкаранёна інавацыйная тэхналогія аплаты праезду ў грамадскім транспарце з дапамогай QR-кода. Праект рэалізавалі за чатыры месяцы пры падтрымцы Мінаблвыканкама. Аўтобусы, абсталяваныя адпаведнай сістэмай, выехалі 6 лютага з гарадскога аўтобуснага парка № 3 «Мінаблаўтатранса». Різліччыца за праезд з дапамогай QR-кода пакуль можна ў аўтобусах, якія курсіруюць па чатырох гарадскіх маршрутах.

У будучым такім чынам можна будзе набываць і праязныя білеты на працяглы тэрмін. У бліжэйшы час падобная сістэма платы за праезд будзе ўведзена і ў іншых гарадах Беларусі. У тэставым рэжыме продаж квіткоў у электронным выглядзе запушчаны ў грамадскім транспарце Гомеля.

Дадатак даступны для пампавання ў AppStore і Play Market.

Акрамя таго, у першай палове года ў Барысаве запланаваны запуск сэрвісу па аплаце праезду бескантактнымі карткамі.

**Сяргей КУРКАЧ,**
**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

Выпуск № 6 (494)

Конкурс

# Дзяржаўныя сімвалы ў мастацкіх творах

Музей сучаснай беларускай дзяржаўнасці — філіял Нацыянальнага гістарычнага музея праводзіць адкрыты конкурс творчых работ «Сімвалы маёй краіны». Ён прымеркаваны да 25-годдзя Дзяржаўнага сцяга і Дзяржаўнага герба.

На конкурс прымаюцца творчыя работы з выявай дзяржаўных сімвалаў Беларусі. Работы могуць быць выкананы ў розных тэхніках: жывапіс, графіка, роспіс па шкле, саломапластыка, вышыўка і іншыя. «Мэта — паказаць у мастацкіх творах дзяржаўныя сімвалы як неад'емны атрыбут суверэнітэту нашай краіны», — адзначылі ў музеі.

Конкурс прадугледжвае два этапы. Прыём, апрацоўка і адбор творчых работ праходзяць з 3 лютага да 13 красавіка 2020 года. Фінальны этап, на якім будуць вызначаць пераможцаў і лаўрэатаў, будзе доўжыцца з 14 красавіка да 5 мая. Удзельнікаў будзе ацэньваць прафесійнае журы. Стваральнікаў лепшых твораў узнагародзяць дыпломамі і памятнымі падарункамі. Творчыя работы пераможцаў возьмуць удзел у часовай экспазіцыі, арганізаванай у музеі сучаснай беларускай дзяржаўнасці ў гонар 25-годдзя зацвярджэння дзяржаўных сімвалаў.

«Першацвет»-2020:

# Паэзія і проза маладых

**Чацвёрты год запар прыходзіць да чытача альманах «Першацвет», які выдае «Мастацкая літаратура»**



У выданні змяшчаюцца творы паэзіі і прозы аўтараў, якія перамаглі ў літаратурным конкурсе маладых пісьменнікаў з аднайменнай назвай — «Першацвет». Сёлета надрукаваны вершы, апавяданні Данііла Арыанава, Аляксандра Бондарава, Мікіты Варанцова, Цімура Вычужаніна, Дар'і Вячэркі, Анастасіі Гакоцінай, Яўгеніі Казарцавай, Арыны Карповіч, Кацярыны Касцевіч, Анастасіі Калацэй, Ганны Комар, Яны Крэмень (Іоны Флінт), Тацяны Курмазіі, Максіма Машкіна, Настассі Мішкавец (Самчанка), Алесі Мялік, Ганны Небаўсенка (Клімаковай), Вольгі Ропат, Надзеі Тачыцкай, Аляксандра Цітова. Наклад выдання — 450 экзэмпляраў. Зусім невялікая лічба, але ж і гэтай колькасці дастаткова, каб чытач у Беларусі пачуў пра новыя імёны, каб займеў пэўнае ўяўленне пра тое, куды, у якіх кірунках развіваецца творчасць маладых літаратараў.

Спадзяёмся, што выпуск альманаха «Першацвет» стане добрай традыцыяй, а аднайменны Міжнародны конкурс будзе і надалей прыцягваць увагу юных творцаў Беларусі, а таксама іншых далёкіх і блізкіх краін. Дарэчы, праводзіцца конкурс пры падтрымцы Выдавецкага дома «Звязда», а непасрэдна — пры падтрымцы часопісаў «Маладосць», «Нёман», газеты «Літаратура і мастацтва».

Сяргей ШЫЧКО.

СУГУЧЧА

# ПРА ПІСЬМЕННІКАЎ, КНІГІ І ЧАС

## Аб чым гаварылі майстры мастацкага слова з розных краін на круглым стале ў Доме літаратара

**Адно з важных мерапрыемстваў, прымеркаваных да традыцыйнай Мінскай міжнароднай кніжнай выстаўкі-кірмашу — сімпозіум літаратараў «Пісьменнік і час», у арганізацыі якога ўдзельнічаюць Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь, Саюз пісьменнікаў Беларусі, Выдавецкі дом «Звязда», выдавецтва «Мастацкая літаратура» пры падтрымцы Міжнароднага фонду гуманітарнага супрацоўніцтва, а таксама Пастаяннага камітэта Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі.**
**У першы дзень выстаўкі пад патранажам Саюза пісьменнікаў Беларусі ў межах буйнога літаратурнага форуму прайшоў круглы стол на тэму «Пісьменнік. Кніга. Час».**

У Доме літаратара сабраліся паэты, празаікі, публіцысты, літаратуразнаўцы, літаратурныя крытыкі, краязнаўцы, выдаўцы, прадстаўнікі адукацыйных устаноў і грамадскіх інстытуцый з двух дзясяткаў краін блізкага і далёкага замежжа: Расіі, Украіны, Польшчы, Славакіі, Вялікабрытаніі, Азербайджана, Ірана, Узбекістана, Казахстана і іншых.

Сярод гаспадароў сустрэчы былі ў першую чаргу тыя, хто мае найбольшы плён у развіцці міжнародных літаратурных стасункаў — Алена Стэльмах, Марыя Кобец, Іна Фралова, Наталля Саветная, Хізры Асадулаеў, Алена Бабок, Святлана Быкава, Анатоль Мацвіенка, Уладзімір Навумовіч.

Падтрымку ў правядзенні круглага стала аказалі прадстаўнікі Грамадскай палаты Саюзнай дзяржавы, у прыватнасці кіраўнік апарата арганізацыі, сябра Саюза пісьменнікаў Расіі Аляксандр Альшэўскі.

* * *

Мемарыяльная зала Дома літаратара, па словах старшыні Саюза пісьменнікаў Беларусі Мікалая Чаргінца, была абрана пляцоўкай пасяджэння нездарма: у ёй змешчаны прозвішчы і партрэты беларускіх пісьменнікаў — удзельнікаў Другой сусветнай вайны, якія змагаліся супраць фашызму — пагрозы для народаў былога Савецкага Саюза і іншых краін свету. Абрана яна яшчэ і за камернасць прасторы, дзе можна адчуць еднасць і таварыскасць. Мікалай Чаргінец выступіў з прывітальным словам, прадставіў кожнага з прысутных асабіста і ўзяў на сябе абавязкі мадэратара круглага стала, адзначыўшы шырыню ўзнятай праблематыкі пасяджэння, прапанаваў усім ахвотным выказацца, расказаць пра досвед работы ў літаратуры, падыскутаваць, параіць адно аднаму.

Асабліва вострай тэмай, узнятай мадэратарам і працягнутай у прамовах шматлікіх гасцей, стала маральна-этычнае пытанне ў сучаснай літаратуры, праблема духоўнага выхавання чалавека праз мастацтва. У гэтым кантэксце разглядалася і запатрабаванасць кнігі і чытання сярод сучаснай моладзі. Сакратар Саюза пісьменнікаў Расіі Юрый Шчуркоў заўважыў, што варта усталяваць здаровы баланс паміж «чалавекам свету» і патрыётам у светапоглядзе сучаснага маладога пакалення і што гэтая праблема таксама можа вырашыцца праз літаратуру. Паэт і перакладчык Юрый Шчарбакоў са шкадаваннем адзначыў, што маладыя пісьменнікі, таленавітыя і адораныя, з прычыны страху незапатрабаванасці літаратурнага твора сыходзяць у іншыя сферы дзейнасці, аднак прадэманстраваў і выпадак выключэння — прадэкламаваў верш якуцкага паэта Гаўрыіла Андросава.





* * *

Адно з важных пытанняў сустрэчы — узаемадачыненні літаратур у свеце, спосабы пашырэння нацыянальнага мастацкага слова сярод іншых краін. У гэтым аспекце выказаліся пісьменнікі-перакладчыкі і выдаўцы, якія ўводзяць замежныя творы ў свой культурны кантэкст. Сярод іх — Валеры Тургай, Юрый Шчарбакоў (Расія), Анхела Эспіноса Руіс (Іспанія), Марыян Серватка (Славакія), Аляксандр Наўроцкі (Польшча) і іншыя.

Захаванне сувязяў праз памяць, праз мемарыялізацыю прадэманстравалі на круглым стале Аркадзь Ялфімаў і Юрый Пермінаў (Расія), якія прэзентавалі на сёлетняй кніжнай выстаўцы выданне «Белорусы в Сибири» — грунтоўна падрыхтаваныя матэрыялы радаводаў, жыццяпісаў, эпісталярнай спадчыны, дзённікаў, падарожных нататак і вершаў паэтаў высылкі Алеся Гаруна, Сяргея Дарожнага, Ядзвігі Бяганскай, Андрэя Александровіча, перакладзеныя на рускую мову Інай Фраловай. Былы пасол Славакіі ў Беларусі, паэт і перакладчык Марыян Серватка расказаў, якія мерапрыемствы праходзяць у Славакіі ў гонар Янкі Купалы, Рыма Абызава (Расія) — пра адзіны ў іх краіне музей-кватэру Песняра ў Татарстане (сяло Печышчы), дзе паэт жыў у эвакуацыі.

Маладая іспанская пісьменніца і перакладчыца Анхела Эспіноса Руіс зазначыла, што ёй вельмі прыемна лічыцца часткай беларускай літаратуры — адной з самых багатых літаратур у свеце. І пажартавала: «Бо ў Іспаніі ніводнага саюза пісьменнікаў няма, а ў Беларусі — аж два!» Нагадаем, што спадарыня Анхела абараніла кандыдацкую дысертацыю па беларускай літаратуры, плённа перакладае з беларускай на іспанскую мову, а таксама з замежных моў — на беларускую.

Публіцыст, намеснік галоўнага рэдактара расійскага часопіса «Наш современник» Аляксандр Казінцаў, бадай, адзін з самых частых наведвальнікаў Беларусі сярод прысутных, падзяліўся ўражаннямі шматгадовых цёплых і плённых стасункаў з беларускімі пісьменнікамі. Адзначыўшы, што іх выданне з'яўляецца ў тым ліку фарпостам беларускага слова, Аляксандр Іванавіч перадаў у Саюз пісьменнікаў свежы нумар часопіса.

Пра магчымасці навукова-культурнага абмену з Азербайджанам расказала спадарыня Флора Наджы, прафесар Бакінскага славянскага ўніверсітэта, галоўны рэдактар часопісаў "Руская мова і літаратура ў Азербайджане", YOL, якая сёлета прыехала ў Беларусь упершыню.

Аляксандр Наўроцкі, імя якога ўжо гучала, прадэманстраваў плён супрацоўніцтва з беларускімі пісьменнікамі — сумесныя польска-беларускія мастацкія зборнікі, падзяліўся тым, як прайшоў Фестываль славянскай паэзіі, складанасцямі і сакрэтамі арганізацыі такіх мерапрыемстваў.

Пісьменнік-марыніст, журналіст, афіцэр-падводнік Мікалай Чаркашын адзначыў, што апошнія яго раманы (у прыватнасці, прэзентаваная на выстаўцы кніга «Брестские врата»), звязаны з нашай краінай, а яго наступны твор пішацца па-беларуску. Сястра пісьменніка, літаратар і пушкініст Ларыса Чаркашына расказала пра кароткі візіт Аляксандра Пушкіна ў Беларусь.

* * *

Завяршыў вечарыну аўтар і выканаўца Рэнат Ібрагімаў, які падараваў калегам дыскі і кнігі са сваімі творамі, а таксама, па шматлікіх просьбах, праспяваў песню.

Напрыканцы сустрэчы гасцей чакала ўзнагароджванне памятнымі знакамі і падзякамі ад арганізатараў мерапрыемства. Госці выказалі захапленне прыгажосцю беларускай сталіцы, гасціннасцю яе жыхароў, падзякавалі за выдатны прыём і арганізацыю мерапрыемства. Гэтым вечарам бібліятэка Саюза пісьменнікаў Беларусі папоўнілася, бадай, не адным дзясяткам добрых кніг на розных мовах. Спадзяёмся, гаспадары круглага стала атрымалі і новыя прапановы аб супрацоўніцтве на будучыню.

**Марына ВАРАБЕЙ.**
**Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.**



На развітанне

# СПАВЯДАЛЬНЫ ШЛЯХ

**Спынілася жыццё народнага артыста Беларусі Барыса Луцэнкі**

Асобы тэатра выконваюць сваё наканаванне нават пасля таго, як гадзіннік перастае адлічваць іх зямны час. Гадзіннік спыняецца, а яны працягваюць размову, якую вялі са сцэны цягам жыцця, часам нават праз эпохі. Барыс Луцэнка — рэжысёр, па якім за савецкім часам пазнавалі беларускі тэатр, — пакінуў свет на 83-м годзе жыцця. Учора з ім развіталіся ў Нацыянальным акадэмічным драматычным тэатры імя Горкага, дзе ён служыў да апошніх дзён. Служыў тэатру і чалавеку, у якога верыў нягледзячы на расчараванні і перасцярогі злому эпох.

«У чалавеку ёсць усё: пэўны працэнт годнасці і подласці, любові і нянавісці, баязлівасці і смеласці, працадзольнасці і ляноты, дабрыні і злосці...» Задача мастацтва — змяніць гэтыя суадносіны хоць бы на некалькі працэнтаў на карысць любові, дабрыні, годнасці. Як гэта зрабіць? Галоўнае — не спрабаваць аднымі лекамі вылечыць усіх. У нашым тэатры гэтую задачу мы імкнёмся рашыць праз індывідуальнае ўздзеянне на кожнага гледача... Для мне Тэатр сёння — гэта майстэрня, дзе людзі могуць вызваліцца ад сваёй персанальнай клеткі нянавісці, подласці, злосці, сквапнасці, зайздрасці... Хай з тысячы гледачоў толькі адзін здолее стаць вольным! Ужо недарэмна пражытае жыццё, ужо Тэатр апраўдаў сваё існаванне...»



Фота дадзена тэатрам імя М. Горкага.

Для Барыса Іванавіча Луцэнкі галоўным было асэнсаванне існавання. Асэнсавана падчас навучання ў чыгуначным тэхнікуме ён зрабіў выбар на карысць сцэны, а далей яго быццам вёў лёс: ураджэнец Кубані стаў студэнтам Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута, а пасля — адным з найярчэйшых прадстаўнікоў беларускага тэатра. З павагай да беларускай культуры ён працаваў у Купалаўскім тэатры, дзе пастаўвіў сваё знакавае «Раскіданае гняздо» паводле Янкі Купалы. Гадоў праз дваццаць ён вернецца да гэтага твора ў кіно: напачатку 90-х грамадства будзе ў пошуку нацыянальнай ідэі. Барыс Луцэнка ведаў, што яна была і ёсць: ён паглыбіўся ў традыцыі, адчуў менталітэт і сам стаў часткай гэтай культуры. Нездарма ў 1995 годзе яму прысвоілі званне народнага артыста Беларусі. У той час Барыс Іванавіч ужо з'яўляўся мастацкім кіраўніком Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Горкага.

Быў час, калі пра Рускі тэатр так і казалі: «тэатр Луцэнкі». Два перыяды работы пад яго кіраўніцтвам (як галоўнага рэжысёра, пасля перапынку — як мастацкага кіраўніка) сапраўды пашырылі славу тэатра, у тым ліку за межамі Беларусі. «Макбет» паводле Шэкспіра — гучная прэм'ера 1974 года, Гран-пры на фестывалі ў Штутгарце, неверагодны поспех у публікі. «Трагічная аповесць пра Гамлета, прынца Дацкага», «Хрыстос і Антыхрыст» паводле Дзмітрыя Мярэжкоўскага — паднятае з глыбінь і перавернутае вось гэтае «чалавечае», падкрэсленае адчуванне магчымай бяды, якая цалкам залежыць ад чалавека. Рэжысёру было важна, каб дадому глядач пайшоў іншым чалавекам.

Істотным бокам служэння Барыса Луцэнкі ў Рускім тэатры стала паспяховая праца з творамі беларускіх аўтараў: Алеся Адамовіча (спектакль «Вяртанне ў Хатынь»), Васіля Быкава («Пайсці і не вярнуцца»), Аляксея Дударава («У прыцемках»). Тут ён зноў звярнуўся да думак Купалы, аднавіўшы легендарны спектакль «Раскіданае гняздо» (па-беларуску на сцэне Рускага тэатра!) ды ўвасобіўшы ўжо ў новым стагоддзі «Сон на Кургане». Дзякуючы Луцэнку тут паўстала «Легенда пра бедпага д'ябла» Уладзіміра Караткевіча.

На якіх бы сцэнах ні ставіў Барыс Луцэнка (лёс даў яму магчымасць папрацаваць на некалькіх), ён быў упэўнены, што «тэатр дапамагае чалавеку спазнаць самога сябе».

**Сяргей КАВАЛЬЧЫК, мастацкі кіраўнік Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Горкага:**

*«Пад кіраўніцтвам Барыса Іванавіча Рускі тэатр дасягнуў творчых вышыняў, таму што ў яго як у рэжысёра быў свой непаўторны почырк, навізна формы і глыбокае пранікненне ў чалавека. Ён умеў дакладна адлюстроўваць час. Мы працавалі разам дзесяць гадоў. Канешне, ён ставіў цікавыя спектаклі, але для мяне таксама важна, што мы выпусцілі курс рэжысёраў у Акадэміі мастацтваў і што Барыс Іванавіч змог перадаць студэнтам частку свайго багатага жыццёвага і рэжысёрскага вопыту».*

**Мікалай ПІНІГІН, мастацкі кіраўнік Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы:**

*«У канцы 1960-х — пачатку 1970-х Барыс Іванавіч шэсць гадоў працаваў у Купалаўскім тэатры, таму ён нам не чужы, я цудоўна памятаю яго спектаклі, напрыклад, «Раскіданае гняздо» — ён тут шмат чаго добрага зрабіў, а потым перайшоў у Рускі тэатр. Я вучыўся ў тэатральна-мастацкім інстытуце на рэжысёра тэлебачання, і Барыс Луцэнка, які вёў у інстытуце курс драмы, бачыў мяне як артыста, бо я іграў у дыпломных спектаклях. Калі я апынуўся на тэлебачанні і прапрацаваў там тры месяцы, ён раптам запрасіў мяне на галоўную ролю сваёй пастаноўкі ў Рускім тэатры. Я быў яму вельмі ўдзячны, таму што ў савецкія часы тэлебачанне было сумнае, а ў тэатры ставілі цудоўныя класічныя і сучасныя п'есы. Я з задавальненнем збег у тэатр. Потым ён стаў мне даваць ставіць, адпаведна свой першы ў жыцці спектакль у прафесійным тэатры я паставіў менавіта ў яго. Ён сыграў у маім прафесійным лёсе вызначальную ролю, ён, можна сказаць, мой прафесійны бацька. У 1970—1980-я гады ён быў, як бы сёння сказалі, модным рэжысёрам, але ставіў сур'ёзныя спектаклі па сур'ёзнай літаратуры. Я лічу, калі Барыс Луцэнка кіраваў Рускім, гэта быў грандыёзны, проста фантастычны тэатр. Тады ўвогуле менавіта Рускі і Купалаўскі вызначалі шлях беларускага тэатра. Уявіце сабе, разам з Расціславам Янкоўскім я іграў у «Макбеце» — з гэтым спектаклем мы ў 1980 годзе месяц вандравалі па Германіі, значыць, гэта быў узровень».*

Кінакрокі

# ПАРАЎНОЎВАЕМ НАМІНАНТАЎ НА «ОСКАР»: ХТО ЛЕПШЫ — ТАРАНЦІНА ЦІ ПОН ЧЖУН ХО?

**Усе, здаецца, ужо паглядзелі і «Джокера», і «1917», і нават «Маленькіх жанчын» — заўтра, 9 лютага, на цырымоніі ўзнагароджвання ў Лос-Анджэлесе будуць агучаныя ўладальнікі прэміі Амерыканскай кінаакадэміі. Узнагарода і мітусня вакол яе, якія не вельмі шануюць адэпты «сапраўднага» кінамастацтва, нечым у кінафестываляў усё ж выйграе — у першую чаргу тым, што да моманту падвядзення вынікаў можна ўбачыць большую частку намінантаў і з азартам сачыць за навінамі. У тым ліку па гэтай прычыне да цырымоніі з'яўляецца безліч рэцэнзій, дыскусій і ставак, у тым ліку грашовых, за кошт якіх «Оскар» абрастае яшчэ шырэйшай і буйнейшай гісторыяй. Тым не менш, прэмія Амерыканскай кінаакадэміі, што часта з ахвотаю патурае глядацкім густам, застаецца, напэўна, самай неадназначнай кінаўзнагародай, пра мастацкія якасці ідзе гаворка ці відавочную кан'юнктуру. А паколькі за і супраць фаварытаў разгараюцца не абы-якія спрэчкі, мы параўноўваем намінантаў і расстаўляем усе кропкі над «і».**

## Квенцін Таранціна>Марцін Скарсэзэ

Два неабвержныя жывыя класікі. Канешне, трохгадзіннае палатно Марціна Скарсэзэ «Ірландзец», у якім рэжысёр чарговы раз паказвае разборкі крымінальнага свету і чарговы раз — беспрынцыпнага галоўнага героя ля разбітых ночваў, не магло не трапіць у спіс намінантаў на «Оскар». Таму што гэта Скарсэзэ, таму што галоўныя ролі ў ім выконваюць Роберт дэ Ніра, Аль Пачына і Джо Пешы і таму што атрымаўся сапраўды дабротны майстэрскі фільм. Але што мы маем апроч майстэрства у рамесніцкім сэнсе слова? — Скарсэзэ паназбіраў улюбёных матываў, што ўжо неаднойчы гучалі ў яго фільмах, зноў раздаў «сваім» акцёрам ролі гарадскіх мафіёзі і заевў шарманку пра іх самабытныя законы. Тое, што мела добры эфект у «Слаўных хлопцах», «Казіно» ці «Бандах Нью-Ёрка», здзівіла сваёй неактуальнасцю і неарыгінальнасцю ў «Ірландцы». Яшчэ большую нацягнутасць фільму надала шчыраванне з камп'ютарнай графікай з мэтай амаладзіць дэ Ніра, што не надта атрымалася.

У гэты час поруч з «Ірландцам» на «Оскар» прэтэндуе карціна «Аднойчы ў... Галівудзе» Квенціна Таранціна — яшчэ аднаго цёртага калача амерыканскага кіно, што таксама апелюе да мінулага. І гэта, у параўнанні з усімі яго сёлетнімі канкурэнтамі, — ідэальны фільм. Настолькі ідэальны, што ён, можа быць, нават не з планеты «Оскар», а па-над ёй. Нягледзячы на тое, што рэжысёр мае справу з рэальнымі падзеямі і праводзіць з імі пэўныя маніпуляцыі, Таранціна абсалютна далёкі ад заяў, адсылак, сімвалаў, алюзій ці пракламацый. Ён стварае — не проста па-майстэрску, а віртуозна — да секунды выверены самастойны свет, унікальны не толькі ў кантэксце фільмаграфіі рэжысёра, але і ў бэкграундзе падрыхтаванага гледача.





## «Джокер»>«1917»

Справа ў маштабах. На першы погляд гэта гучыць дзіўна, але амбітнае, знятае быццам адным планам, роўд-муві Сэма Мэндэса, ад якога ты «ухаеш» бы на амерыканскіх горках, значна саступае ўмоўна коміксаваму фільму пра знакамітага ліхадзея з-за простасці сваіх памкненняў. Так, Мэндэс паказвае гераізм звычайнага капрала, то-бок другараднага іграка, на першай сусветнай вайне, што ўжо нядробна, і нават мае да гэтай гісторыі асабістае дачыненне. Але ў цэлым карціна «1917» замыкаецца на сваёй тэхналагічнай задачы і задачы, скажам, зрабіць два ўражальныя прабегі, на што растрачваецца амаль увесь патэнцыял і што яшчэ больш выкрываецца праз фальшывы лірызм. Мне як гледачу гэтага мала.

Фільм жа Тода Філіпса, які таксама канцэнтруецца на чалавеку ў яго супрацьстаянні наваколлю, ідзе ўглыб і становіцца ў першую чаргу маштабным выказваннем пра грамадства, а ў другую, з апакаліптычным пераваротам і алюзіямі на Хрыста, выходзіць на ў прынцыпе неахопны метафізічны рэгістр. Вось гэтага мне дастаткова. І Сэм Мэндэс, і Тод Філіпс ставяць перад сабой сур'ёзныя задачы, і абодва з імі спраўляюцца, толькі ў першага сюжэт аказваецца на службе атракцыёна, а ў другога ўсё падпарадкоўваецца трагічнаму станаўленню Джокера і сэнсам, якія за гэтым ідуць.

## «Цела Божае»>«Паразіты»

Намінацыя «Найлепшы замежны мастацкі фільм» на «Оскары» цікавіць мяне найбольш — звычайна менавіта ў гэтай падборцы шукаеш сапраўднае мастацтва кіно, як бы па-сноўбску гэта ні гучала. Таму ад мысленнага раздзялення на ўмоўны «Галівуд» і аўтарскія фільмы складана адчапіцца, праўда, гэтым разам адзін з відавочных фаварытаў прэміі — уладальнік «Залатой пальмавай галіны» фільм «Паразіты» Пон Чжун Хо — трапіў у замежную «рэзервацыю» і ўнутраныя намінацыі адначасова. Карціна стала сапраўдным хітом мінулага года — Пон Чжун Хо аб'яднаў некалькі жанраў, якія плаўна пераходзяць адзін у другі, і паказаў, як на чалавека ўплываюць сацыяльныя ўмовы і класавае раздзяленне. І адказнасць за злачынствы пераклаў менавіта на сацыяльныя ўмовы, хоць гэта не новая думка. «Паразіты» — ладны, стройны, але ў пэўным сэнсе механічны фільм. Мы бачым яго вінцікі, шпунцікі і маніпуляцыі быццам геаметрычную фігуру.

А калі паглядзець, як праз метафары, алюзіі і кінамову ірае і пераліваецца «Цела Божае» Яна Камасы, стане зразумела, дзе замест цвярозага разліку шукаць магію кіно. Польскі фільм апроч уласна надрыўной гісторыі разважае з гледачом візуальнымі вобразамі, кампазіцыяй кадра і чароўным выканаўцам ролі ілжэсвятара Барташам Бяленем. Хоць для належнага ўражання хапае ўжо толькі амбіцый сюжэта, што мае справу з ментальным болем, прапрацоўкай траўм мінулага і грунтоўным антыклерыкальным выпадам. Ян Камаса выказваецца пра крывадушнае сучаснае польскае грамадства, а ў той жа час праз вобраз Хрыста ў цэнтральным персанажы робіць сваю заяву ўсёахопнай. «Цела Божае» з яго спалучэннем зямнога і ўзвышанага — адзін з самых прыгожых і грунтоўных бунтаў у сучасным кіно, а рэжысёр сваім разуменнем прыроды фільма значна перасягае Пон Чжун Хо.

**Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ
### о проведении повторного аукциона
### Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению антикризисного управляющего частного предприятия «Аналитик-центр» в процедуре экономической несостоятельности (банкротстве) проводит повторный открытый аукцион по продаже имущества ОАО «Борисовское предприятие музыкальных инструментов» в составе

| № лота | Наименование | Начальная цена, без учета НДС, бел. руб. | Задаток, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | **Изолированное помещение (корпус № 1, инв. № 610/D-56419**, *общая площадь – 6020,4 м$^2$), расположенное по адресу:* Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, ул. 30 лет ВЛКСМ, 36/26-1 | 154 367,85 | 15 436,78 |
| 2 | **Изолированное помещение (корпус № 2, инв. № 610/D-56428**, *общая площадь – 9599,0 м$^2$), расположенное по адресу:* Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, ул. 30 лет ВЛКСМ, 36/27-1 | 269 997,00 | 26 999,70 |
| 3 | **Капитальное строение (пристройка к корпусу № 1 (изготовление футора), инв. № 610/С-53920, общая площадь – 1535,4 м$^2$)**, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 620850100008001098 по адресу: Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, ул. 30 лет ВЛКСМ, 36/23 | 97 433,70 | 9743,37 |
| 4 | **Капитальное строение (цех сувениров, инв. № 610/С-53934, общая площадь – 290,2 м$^2$)**, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 620850100008001105 по адресу: Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, ул. 30 лет ВЛКСМ, 36/12 | 18 078,06 | 1807,80 |
| 5 | **Изолированное помещение (цех ширпотреба, инв. № 610/D-56375, общая площадь – 1872,6 м$^2$)**, расположенное по адресу: Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, ул. 30 лет ВЛКСМ, 36/19-1 | 126 781,20 | 12 678,12 |
| 6 | **Капитальное строение (цех металлодеталей, общая площадь – 1924,9 м$^2$)**, **капитальное строение (здание растворно-бетонного узла, инв. № 610/С-53921, общая площадь – 20,3 м$^2$)**, расположенные на земельном участке с кадастровым номером 620850100008001099 по адресу: Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, ул. 30 лет ВЛКСМ, 36/3 | 67 264,47 | 6726,44 |
| 7 | **Капитальное строение (РМЦ, инв. № 610/С-53918, общая площадь – 1161,2 м$^2$)**, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 620850100008001097 по адресу: Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, ул. 30 лет ВЛКСМ, 36/18 | 43 669,08 | 4366,90 |
| 8 | **Капитальное строение (прирельсовый склад хранения лаков и красок, инв. № 610/С-53946, общая площадь – 424,3 м$^2$)**, **капитальное строение (станция перекачки, инв. № 610/С-53944, общая площадь – 41,8 м$^2$)**, расположенные на земельном участке с кадастровым номером 620850100008001118 по адресу: Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, ул. 30 лет ВЛКСМ, д. 36, корп. 10 | 28 220,56 | 2822,05 |
| 9 | **Капитальное строение (склад готовой продукции, инв. № 610/С-53933, общая площадь – 717,0 м$^2$)**, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 620850100008001104 по адресу: Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, ул. 30 лет ВЛКСМ, 36/11 | 39 266,96 | 3926,69 |
| 10 | **Капитальное строение (сушильно-раскроечный цех**, общая площадь – 2023,5 м$^2$), расположенное на земельном участке с кадастровым номером 620850100008001100 по адресу: Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, ул. 30 лет ВЛКСМ, 36Г | 62 216,70 | 6221,67 |
| 11 | **Капитальное строение (лесопильный цех, общая площадь – 538,9 м$^2$),** расположенное на земельном участке с кадастровым номером 620850100008001105 по адресу: Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, ул. 30 лет ВЛКСМ, 36/13 | 27 234,48 | 2723,44 |
| 12 | **Капитальное строение (электроцех, цех раскроя фанеры, компрессорная, инв. № 610/С-53929, общая площадь – 639,2 м$^2$)**, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 620850100008001095 по адресу: Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, ул. 30 лет ВЛКСМ, 36/17 | 27 821,43 | 2782,14 |
| 13 | **Капитальное строение (бойлерная, инв. № 610/С-53925, общая площадь – 43,7 м$^2$)**, **сооружение (навес для ПВМ, инв. № 610/С-53940, площадь – 45 м$^2$),** расположенные на земельном участке с кадастровым номером 640400000008000182 по адресу: Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, ул. 30 лет ВЛКСМ, 36/24 | 5928,20 | 592,82 |
| 14 | **Капитальное строение (здание трансформаторной подстанции, инв. № 610/С-53943, общая площадь – 350,1 м$^2$), капитальное строение (низконапорная станция перекачки сточных вод, инв. № 610/С-53941), сооружение (труба дымовая кирпичная, инв. № по бух. учету 20014**, расположенные на земельном участке с кадастровым номером 620850100001002774 по адресу: Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, ул. 30 лет ВЛКСМ, 36 | 57 225,07 | 5722,50 |
| 15 | **Капитальное строение (насосная станция 1-го подъема, инв. № 610/С-53937, общая площадь – 94,8 м$^2$)**, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 620850100001002787 по адресу: Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, ул. 30 лет ВЛКСМ, 36/6 | 4132,13 | 413,21 |
| 16 | **Капитальное строение (насосная станция 2-го подъема, инв. № 610/С-53938, общая площадь – 63,1 м$^2$)**, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 620850100008001100 по адресу: Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, ул. 30 лет ВЛКСМ, 36/4 | 6010,37 | 601,03 |
| 17 | **Капитальное строение (пост приема и выдачи нефтепродуктов, инв. № 610/С-53945, общая площадь – 47,3 м$^2$)**, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 620850100001002786 по адресу: Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, ул. 30 лет ВЛКСМ, 36/8 | 2864,32 | 286,43 |
| 18 | Оборудование | 939,00 | 93,90 |
| 19 | Оборудование | 2944,27 | 294,42 |
| 20 | Оборудование | 41 216,55 | 4121,65 |
| 21 | Электрооборудование | 123,50 | 12,35 |
| 22 | Сушильный тоннель для лаковых покрытий | 69,50 | 6,95 |
| 23 | Оборудование | 1531,50 | 153,15 |

Стоимость по лотам №№ 1–17 снижена на 30 % от первоначального размера, по лотам №№ 18–23 снижена на 50 % от первоначального размера.

Имущество должника, составляющее лот № 23, обеспечивает работоспособность предприятия и иных лиц (арендаторов и собственников земли и объектов, расположенных на бывшей территории должника), в связи с чем покупатель данного имущества принимает на себя обязательство по дальнейшему обеспечению работы данных объектов с заключением соответствующих договоров с потребителями электроэнергии, запитанными от продаваемых объектов имущества.

В соответствии с абзацем 4 п. 1.2 Указа Президента Республики Беларусь от 05.02.2013 № 63 «О некоторых вопросах правового регулирования процедур экономической несостоятельности (банкротства)» государственная регистрация создания капитальных строений, которые выставлены на торги без наличия документов, будет осуществляться в установленном порядке по заявлению покупателя и за его счет.

С полным перечнем имущества, входящего в состав лотов, можно ознакомиться на сайте **https://bankrot.gov.by.**

Шаг аукциона – 5 (пять) процентов.

**Задатки (10 % от начальной цены) перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».** Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) календарных дней со дня проведения аукциона, если иной срок не будет установлен собранием (комитетом) кредиторов.

**Победитель аукциона (единственный участник аукциона) в течение 5 (пяти) банковских дней со дня проведения аукциона оплачивает вознаграждение в размере 10 % от цены продажи предмета аукциона (по лотам №№ 13, 15–19, 21–23) и в размере 5 % (по лотам №№ 1–12, 14, 20).**

Условия аукциона:

- имущество приобретается на условиях 100 % предоплаты и оплаты Покупателем (единственным участником) аукциона комиссионного вознаграждения банку за проведение данного платежа;
- на Покупателя возлагаются расходы, понесенные организатором торгов при проведении торгов по продаже имущества должника, в том числе оплата размещения сведений о торгах в СМИ;
- Покупатель обязан за свой счет принять приобретаемое имущество, в том числе осуществление вывоза, хранения, погрузочно-разгрузочных работ, демонтажа;
- на Покупателя возлагается обязанность по переоформлению (в ГАИ, военкомате), снятию и постановке на учет приобретаемого имущества за свой счет.

Лица, желающие участвовать в торгах, обязаны подать организатору торгов в указанный в извещении о проведении торгов срок заявление на участие в торгах с приложением следующих документов:

- заверенного банком документа, подтверждающего внесение суммы задатка на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении о проведении торгов;
- для индивидуального предпринимателя – копии свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя (без нотариального засвидетельствования);
- для юридического лица – доверенности, выданной представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), а также копии свидетельства о государственной регистрации юридического лица (без нотариального засвидетельствования);
- для иностранного юридического лица, иностранной организации, не являющейся юридическим лицом, созданной в соответствии с законодательством иностранных государств иностранным государством и его административно-территориальными единицами в лице уполномоченных органов, международной организации – легализованных в установленном порядке копий учредительных документов, выписки из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течении шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иного эквивалентного доказательства статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документа о финансовой состоятельности, выданного обслуживающим банком (без нотариального засвидетельствования);
- для представителя гражданина Республики Беларусь, в том числе индивидуального предпринимателя, – доверенности, оформленной в соответствии с законодательством.

При подаче документов на участие в торгах граждане Республики Беларусь, иностранные граждане и лица без гражданства, а также граждане Республики Беларусь, постоянно проживающие за пределами Республики Беларусь, в том числе представители юридических лиц Республики Беларусь, предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Победителем признается участник торгов, предложивший наиболее высокую цену приобретения лота по сравнению с предложениями других лиц.

Участникам, не признанным победителями, задаток возвращается в безналичной форме в течение 3 банковских дней с момента утверждения протокола об итогах торгов.

Результаты торгов оглашаются публично в день проведения торгов.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, предмет торгов продается этому частнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Организатор аукциона вправе отказаться от их проведения не позднее чем за пять дней до даты их проведения.

Порядок проведения торгов и оформление участия в торгах определяется условиями о проведении торгов ознакомиться с которым можно в дни приема заявлений на участие в торгах, а также на сайте организатора торгов www.rlt.by. Предыдущее извещение по лотам №№ 1–17 опубликовано в газете «Звязда» от 02.11.2019 г., 3.12.2019 г., предыдущие извещения по лотам №№ 18–21 опубликованы в газете «Звязда» от 19.09.2019 г., 31.10.2019 г., 16.11.2019 г.

Аукцион состоится **24.02.2020 в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **21.02.2020** до **17.00** по указанному адресу. **Тел.: (8017) 207-71-34, (8029) 102-21-17.**

УНП 600012350

## Извещение о проведении повторного аукциона

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б |
| **Продавец** | ЗАО «АТЛАНТ», г. Минск, пр-т Победителей, 61 |

**Предмет аукциона – имущество, реализуемое одним лотом, в следующем составе**

| Наименование, назначение | Общ. площадь | Инв. номер |
|---|---|---|
| **База РСУ** (здание специализированное иного назначения) | 2714 кв. м | 110/С-107599 |
| **Составные части и принадлежности:** две пристройки. **Адрес:** Брестская обл., Барановичский р-н, Столовичский с/с, 213/1, база РСУ, 1,4 км севернее д. Антоново | | |
| **Склады РСУ** (здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ) | 322,6 кв. м | 110/С-107598 |
| **Адрес:** Брестская обл., Барановичский р-н, Столовичский с/с, 213/2, склады РСУ, 1,4 км севернее д. Антоново | | |

**Сведения о земельном участке:** предоставлен на праве постоянного пользования общей площадью 0,7077 га для обслуживания базы РСУ и складов РСУ

| | |
|---|---|
| **Начальная цена с НДС 20 %** | 254 016,00 бел. руб. (снижение на 40 %) |
| **Сумма задатка** | 30 000,00 бел. руб. |

**Задаток** перечисляется на счет BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638

**Срок заключения договора купли-продажи: 20** рабочих дней после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

**Дополнительная информация:** победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, возмещает продавцу затраты по проведению рыночной оценки предмета аукциона по **в сумме** 666,90 бел. руб.

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by**

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 21.01.2020 г.

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения аукциона** | **20.02.2020** в 12.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ООО «ИПМ-Консалт оценка»** |
| **Дата и время окончания приема документов** | **18.02.2020** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ООО «ИПМ-Консалт оценка»** |
| **Контактные телефоны** | **+375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42. E-mail: auction@cpo.by** |

### РУП «Институт недвижимости и оценки» (Организатор аукциона) извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества ОАО «ДОРОРС» (Продавец)

**Лот № 1:** здание приемного пункта, инв. № 240/С-45935. Площадь – 49,8 кв. м. Адрес: г. Орша, ул. Станционная, 1В. Земельный участок: кадастровый номер 242400000001010945, площадь – 0,0138 га. Право постоянного пользования. **Начальная цена с НДС – 3788,51 бел. руб.** Задаток – 378,85 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.

Размер штрафа, предусмотренного соглашением о правах и обязанностях сторон в процессе организации и проведения аукциона, составляет 1000,00 бел. руб.

Аукцион состоится **21.02.2020** в **10.00** по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4.

Порядок оформления участия в аукционе, условия участия в аукционе, срок заключения договора купли-продажи, условия оплаты, а также полный текст извещения содержатся на сайте Организатора аукциона ino.by. Задаток перечисляется на р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе 21.02.2020. Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.00 и с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 7. Окончание приема заявлений – 19.02.2020 в 11.00. Первое полное извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 28.02.2019 г.

**☎ Организатор аукциона: 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

В извещении о проведении электронных торгов по продаже имущества **унитарного предприятия «Ружанская мебельная фабрика»,** опубликованном в газете «Звязда» от 05.02.2020 г., вносится уточнение: объекты недвижимости, указанные в таблице в п. 1–10, продаются одним лотом. Начальная цена – 78 435,63 бел. руб. без НДС, минимальная цена – 50 983,15 бел. руб. без НДС. Остальные условия без изменений. Подробнее на beltorgi.by

УНП 200254688

### РУП «Институт недвижимости и оценки» (Организатор аукциона) извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества ОАО «ДОРОРС» (Продавец)

**Лот № 1:** помещение магазина № 22, инв. № 240/D-37906. Площадь – 231,5 кв. м, г. п. – 1958. Адрес: г. Орша, ул. Станционная, 1–18. Земельный участок: кадастровый номер 242400000001001195, площадь – 0,0793 га. Право постоянного пользования (доля 77/345). **Начальная цена с НДС – 32 118,00 бел. руб.** Задаток – 3211,80 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.

Размер штрафа, предусмотренного соглашением о правах и обязанностях сторон в процессе организации и проведения аукциона, составляет 5000,00 бел. руб.

Аукцион состоится **21.02.2020** в **11.00** по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4.

Порядок оформления участия в аукционе, условия участия в аукционе, срок заключения договора купли-продажи, условия оплаты, а также полный текст извещения содержатся на сайте Организатора аукциона ino.by. Задаток перечисляется на р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе 21.02.2020. Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.00 и с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 7. Окончание приема заявлений – 19.02.2020 в 11.00. Первое полное извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 28.02.2019 г.

**☎ Организатор аукциона: 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

Погляд на праблему

# ДУХОЎНЫЯ БАНКРУТЫ

## Чаму ў нашым грамадстве вырастаюць такія нядбалыя бацькі?

**Гэта гісторыя пранеслася па прасторах інтэрнэту ў апошнія дні студзеня, і неяк асабліва зачапіла. Чацвёра дзяцей у адной з вёсак Баранавіцкага раёна некалькі дзён правялі ў халоднай хаце без ежы, пакуль іх не забралі работнікі міліцыі і аддзела адукацыі. Здавалася б, нічога асабліва новага: штогод адкрываюцца дзіцячыя дамы сямейнага тыпу, дзеці ўладкоўваюцца ў прыёмныя і апякунскія сем'і ўсё па той жа прычыне. Іх бацькоў прызналі няздольнымі выконваць свае абавязкі. Можна сказаць, маладыя, найчасцей, здаровыя суайчыннікі аказаліся духоўнымі банкрутамі.**



### ВЫМУШАНАЕ СТАЛЕННЕ

Але ў той, баранавіцкай гісторыі ў мяне камяк да горла падступіў ад аповеду пра паводзіны старэйшай, 9-гадовай, дзяўчынкі. Яна, нібы дарослая, у адсутнасць бацькоў кожны вечар ставіла будзільнік, ранкам апранала меншых у школу і садок, выпраўляла іх, а потым ішла сама на ўрокі. Малыя былі хворыя, з тэмпературай, але ж ісці мусілі, там можна было хоць паесці ды сагрэцца. У хаце стаяў холад, печы ж усе дні ніхто не распальваў.

Згадалася заметка, прачытаная вельмі даўно ў газеце «Известия». Яны тады па сутнасці перадрукавалі матэрыял свайго франтавога карэспандэнта часоў вайны. Невялікая замалёўка, добра помню, называлася «Мужык і баба». Аўтар знайшоў іх у адной рускай вёсцы, нядаўна вызваленай. Іх бацькі загінулі. Хлопчык і дзяўчынка, аднаму з іх было крыху менш за дзесяць, другому — крыху больш, трымалі хатнюю гаспадарку: кармілі карову і іншую жыўнасць, палілі ў печы, тая гаспадынька нават хлеб пякла. Дзеці трымаліся, паводзілі сябе нібы маленькія дарослыя. Франтавік быў узрушаны тым, што зрабіла з дзецьмі вайна. Дык там вайна! А тут уражвае вымушаная сталасць малой у XXI стагоддзі, калі мы прывыклі апякаць дзяцей нават пасля іх паўналецця.

Цяпер тыя дзеці з Баранавіцкага раёна ў поўнай бяспецы. Дзяўчынку адразу забралі ў прытулак, малых, якія былі прастуджаныя, пралячылі ў дзіцячай бальніцы, а пасля выпіскі накіравалі таксама ў прытулак. Там яны сустрэліся са сваёй старэйшай сястрой, якая прывыкла за імі прыглядваць. **Дырэктар Баранавіцкага сацыяльна-педагагічнага цэнтра Ксенія АБЖЭЛЬЯН** сказала, што дзеці вельмі добрыя, паслухмяныя, памяркоўныя, выхаваецелі з імі асаблівых праблем не маюць. Яно і зразумела, з малых дзён прывучаныя быць самастойнымі, нікому не замінаць, не тое што капрызіць.

### ШМАТДЗЕТНЫЯ БАЦЬКІ

А што ж нашы героі, у сэнсе бацькі? Пасыпалі галовы попелам і пабеглі прасіць вярнуць дзяцей? Калі так думаеце, вельмі памыляецеся. У прытулку сказалі, што з 22 студзеня, калі старэйшую дзяўчынку туды прывезлі, ніхто не пазаваніў, не прыйшоў, не пацікавіўся яе лёсам і знаходжаннем. Няма іх, нібы памерлі. Не можа трапіць да гэтых нядбайных грамадзян пакуль і ўчастковы. Калі забіралі дзяцей, іх не назіралася ў ваколіцы. Малыя сказалі, што мама і тата сышлі яшчэ недзе ў нядзелю, а на дварэ была ўжо серада. Верагодна, яны, як і ўся краіна, з інтэрнэту ведаюць пра тое, дзе і як іх дзеці. Цяпер супрацоўнік міліцыі, які спрабаваў адшукаць названых грамадзян, штодзень назірае замок на дзвярах кватэры, а ноччу, паводле слоў суседзяў, у доме часам гарыць святло. Апошняе дае падставы меркаваць, што блудныя бацькі вярнуліся, але не спяшаюцца трапляцца на вочы любым прадстаўнікам улады.

**Звычайна, калі дзяцей забіраюць з сям'і, якой бы яна не была, малыя плачуць, просяцца да мамы і таты. Гэтыя не плакалі і не прасілі, яны амаль што з радасцю сыходзілі з дому, дзе спазналі голад і холад.**

**Старшыня Крошынскага сельскага Савета Таццяна ШЧАРБАЦЭВІЧ** расказала карэспандэнту «Звязды», як доўга і беспаспяхова ўсе службы змагаліся за гэтую сям'ю. Пастаянна іх наведвалі, бо яны даўно стаялі на ўліку як сацыяльна-небяспечная сям'я. Выклікалі на ўсе магчымыя камісіі і каардынацыйныя саветы, прасілі, ушчувалі, пераконвалі. Аднойчы дзяцей ужо забіралі, але тады паверылі ў шчыры намер бацькоў змяніць стасоўнішча да лепшага. Вярнулі.

Як шматдзетнай сям'і ім у свой час выдзелілі вялікую кватэру ў двухкватэрным доме. Вёска Альсевічы знаходзіцца ў дзесяці мінутах язды ад горада, значыць, ёсць усе ўмовы для паспяховага працаўладкавання і належнага ўтрымання дзяцей. Бацька гэтага семейства, як высветлілася, наогул працаваць не асабліва любіць. Маці адзін час працавала даяркай, уладкоўвалася на нейкую работу ў Баранавічах, але як і муж, нідзе не затрымлівалася. Ранейшыя гады, трэба думаць, жылі на дзіцячую дапамогу. Цяпер, калі старэйшаму хлопчыку ўжо споўнілася чатыры, выжываць стала больш складана, выраслі даўгі за камунальныя паслугі, за нейкія неабходныя рэчы для школы, ды і есці ж нешта трэба. Вось і сталі гаспадары перыядычна знікаць з дому.

Дарэчы, пасля таго, як уся гэта гісторыя стала набыткам шырокай грамадскасці, нават пракуратура правярала сельвыканкам на прадмет работы з праблемнай сям'ёй, але ніякіх парушэнняў выяўлена не было. Ды Таццяна Пятроўна сама сябе дакарае, што не настаяла раней, каб дзяцей забралі. Названае пытанне ўзнімалася некалькі разоў. Яна прапаноўвала вырашаць яго кардынальна. Але ж педагогі і сацыяльныя работнікі кожны раз сумняваліся. Бо бацькі, маладыя і здаровыя, не зусім горкія п'яніцы, у якіх ад смецця цераз парог не пераступіць. Тут у хаце не раз заставалі адносны парадак, дзеці хадзілі ў школу і садок чыстыя, знешне дагледжаныя. Усё думалі, а раптам прачнецца ў іх бацькоўскае ці чалавечае сумленне. Памыліліся. Цяпер далейшы лёс дзяцей вырашыць суд. Няцяжка спрагназаваць, што нядбайныя сужэнцы будуць пазбаўленыя бацькоўскіх правоў, а клопат пра дзяцей возьме на сябе дзяржава, гэта значыць, мы з вамі. Як, дарэчы, і пра многіх іхніх таварышаў па няшчасці, па сямейных драмах, якія вельмі розныя і адначасова падобныя.

### МАКАРОНА І СОЛЬ

І яшчэ, дэталь, якую заўважыла старшыня сельскага Савета. Звычайна, калі дзяцей забіраюць з сям'і, якой бы яна не была, малыя плачуць, просяцца да мамы і таты. Гэтыя не плакалі і не прасілі, яны амаль што з радасцю сыходзілі з дому, дзе спазналі голад і холад. Бо дарослыя, якія іх забіралі, нават у верхнім адзенні адчулі холад у выстуджанай хаце.

**«Яны не прывыклі сябе абцяжарваць. І многія з падобных ім бацькоў, на жаль, разглядаюць дзяцей амаль што ў якасці крыніцы даходу. А што, цяпер дапамогу плацяць добрую, жыллём бясплатным забяспечаць. Нямала розных дабрачынных арганізацый, якія і да школы дапамогуць сабраць, і пад Новы год цукерак падкінуць».**

Гэтыя малыя гаротнікі так уразілі работнікаў інспекцыі па справах непаўналетніх райвыканкама, што апошнія вырашылі падарыць ім крышачку свята. Завялі ў кінатэатр на прагляд мульцікаў, потым на прагулку ў забаўляльны дзіцячы пакой, дзе частавалі піцай, цукеркамі, папкорнам. Такія просценькія дзіцячыя радасці, якімі зусім не здзівіш дзяцей са звычайнай сям'і, сталі для іх ледзь не падарожжам у казку. Яны такога раней у вочы не бачылі.

Мама і тата не балавалі забаўлянкамі, не клапаціліся нават аб надзённым. У доме 35-гадовага бацькі і 32-гадовай маці, якія пакінулі дзяцей на некалькі дзён, 22 студзеня ўдалося адшукаць толькі пачак макароны ды пачак солі. Здавалася б, калі вы нарадзілі чацвярых, то павінны працаваць ад цямна да цямна, а можа яшчэ і ноччу дзе падпрацоўваць вартаўніком. Тым больш што вялікі горад побач, работу можна знайсці заўсёды. Але яны, выходзіць, лічаць інакш, яны не прывыклі сябе абцяжарваць. І многія з падобных ім бацькоў, на жаль, разглядаюць дзяцей амаль што ў якасці крыніцы даходу. А што, цяпер дапамогу плацяць добрую, жыллём бясплатным забяспечаць. Нямала розных дабрачынных арганізацый, якія і да школы дапамогуць сабраць, і пад Новы год цукерак падкінуць.

### МАЦЯРЫНСКІЯ ПАЧУЦЦІ

А тое што дзеці — гэта штодзённая праца, або, як сказаў адзін святар, маці вялікага сямейства заўсёды ахвяраваная на служэнне дзецям, ім, падобна на тое, ніхто не расказваў. А калі і расказваў, яны не слухалі, нібы нядбайныя вучні прапускалі міма вушэй. Яны кіруюцца другімі каштоўнасцямі. Дык як жа спрадвечны інстынкт захавання нашчадкаў, які адыграў не апошнюю ролю ў тым, што жывыя істоты, у тым ліку чалавек, наогул не зніклі за мільёны гадоў?.. Нядаўна калега прыслала кранальнае відэа аб тым, як кнігаўка абараняе сваё гняздо. Гняздо было на полі, якое прыйшоў араць магутны трактар. І вось, калі гэтая махіна непазбежна насоўвалася, адчайная птушка стала над гняздом і распасцерла крылы, ахвяруючы тым самым сябе на непазбежную гібель. Праўда, у тым сюжэце нейкім чынам кіроўца заўважыў жывую істоту і паспеў падняць прычапны агрэгат, пакідаючы жыццё бясстрашнай пёрыстай маці. Жалезная махіна прайшла над ёю.

Птушкі, выходзіць, захавалі ўсё лепшае, падараванае прыродай, а людзі, як бачым, не ўсё. І гэта ўжо большая навала, чым праблема п'янства, асацыяльных паводзінаў. Бывала не раз, што пітушчыя маці пасля таго, як забяруць дзяцей, назаўтра бягуць, умольваюць аддаць, горкімі слязьмі плачуць. А тут глухое маўчанне, падобнае да нейкага акамянення душаў. Тых, пра якіх ішла гаворка, можна, відаць, сёння не толькі пазбавіць бацькоўскіх правоў, але і прыцягнуць да адказнасці за пакіданне малых у небяспецы. Толькі ці паможа гэта ім, ці паслухмяных урокам іншым, не ведаю. У мяне няма адказаў на гэтае пытанне.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

Ну і ну!

## «Пахучая» помста за здраду

**У Бярэзінскі РАУС звярнуўся жыхар вёскі Трасцянка. Невядомы падчас яго адсутнасці разліў у пакоях дома «арганічны бруд» і сапсаваў маёмасць.**

Участковым інспектарам міліцыі неўзабаве быў устаноўлены падазраваны. Ім апынулася сужыцелька заяўніка і маці яго дзіцяці. Даведаўшыся пра гэта, мужчына «даў задні ход» заяве і не пажадаў караць жанчыну за яе ўчынак. Як ён прызнаўся, віной усяму стала яго здрада.

У Бярэзінскім РАУС мяркуюць, што жанчына зрабіла гэта ў адчаі, з-за таго, што яе падманулі. З падобным высвятленнем адносін тут сутыкнуліся ўпершыню.

Дарэчы, з пачатку года ў раённы аддзел унутраных спраў з нагоды сямейных скандалаў і сварак звярнуліся 19 чалавек. Пераважная большасць заяўнікаў — жанчыны, якія скардзяцца на мужчын, што злоўжываюць алкаголем.

## Выбівалі неіснуючы доўг па аліментах

**Крымінальная гісторыя ў Шумілінскім раёне пачалася з-за няпростых узаемаадносін былых мужа і жонкі. Раней яны жылі разам, у шлюбе нарадзілася дзіця. Калі сям'я распалася, жанчына пераехала ў Наваполацк, дзе знайшла новага сужыцеля. Менавіта ён са сваім таварышам і вырашыў выбіць з вяскоўца нібыта належныя яго каханай аліменты. Характэрна, як паведамляе аддзяленне інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Віцебскага аблвыканкама, што жанчына да былога мужа фінансавых прэтэнзій пасля разводу не мела.**

Падазраваныя 1978 і 1982 гадоў нараджэння выпівалі разам і ў нейкі момант вырашылі пакараць крыўдзіцеля і адправіліся да яго дадому. Там парачка збіла пацярпелага і стала патрабаваць ад яго доўг на ўтрыманне дзіцяці. Напалоханы вясковец адказаў, што грошай дома няма, і прапанаваў прайсці да банкамата, дзе можна зняць наяўнасць. Прыйшоўшы на месца, мужчына некалькі разоў спецыяльна няправільна ўвёў пін-код. Падазраваныя зразумелі, што іх хочуць падмануць, і яшчэ раз збілі пацярпелага, пасля чаго той сказаў, што аддасць грошы дома.

Атрымаўшы 5000 расійскіх рублёў, зламыснікі не адчапіліся ад мужчыны. Яны ўжо ўтрох адправіліся да былой жонкі вяскоўца, дзе прымусілі таго прасіць прабачэння. Раней атрыманыя грошы яны аддалі жанчыне, але з умовай, што яна абмяняе іх на беларускія рублі і верне ім долю.

Пацярпелы жыхар Шумілінскага раёна праз дзень звярнуўся з заявай у мясцовы РАУС. Праваахоўнікі ўстанавілі ўсе абставіны здарэння. Следчымі ў дачыненні да падазроных распачата крымінальная справа.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# «Вобшук робіць гэты коцік: Мігам знюхае наркотык...»

**Народная кацiная мудрасць: «Хто рана ўстае, той есцi дае». А калі не хоча ўставаць — дык яго ж і падняць тады можна...**
**Расказвалі, адна вось такая котка-нахаба звычку займела — раніцай ускочыць на ложак, на гаспадара (ён халасцяк, але ж дзевак прыводзіў) і сваёй пыскай — у вусны яму, у твар...**
**Той, бывала, узрадуецца: абдыме яе, пагладзіць... А надоечы — заслабаўся (мо кароткая ноч была?) — узяў і адпіхнуў, гаркнуў:**
**— Псік, халера! Як ты мяне дастала!..**
**Цяпер са сваёй каханай памірыцца не можа. Клопат, нават бяда ў чалавека...**
**І каб толькі ў гэтага, а то ж не, як людзі пішуць, гледзячы, у прыватнасці, на чарговы конкурсны здымак ды прыдумваючы да яго свае подпісы. Чытаем, што атрымалася? Вызначаем, у каго найлепей?**

*Без нагляду дзед Міхед*
*Кінуў свой веласiпед.*
*Зразумеў, што разяваты,*
*Як заспеў*
*у коткі свята, —*

піша так **спадарыня Іна Алісевіч з Уздзеншчыны**. Нешта падобнае ўбачыў на здымку і **спадар Валерый Гаўрыш з Чавусаў**:

*З крамкі неяк ехаў дзед,*
*Вёз на ровары пакет...*
*Да яго памкнуўся коця?*
*Значыць,*
*там ляжыць смакоцце?*
*...Не сядзі, стары,*
*у суседкі,*
*Бо нарвешся на аб'едкі!*

Адкуль яны возьмуцца, можна было б не пісаць, аднак радочкі пра гэта ў пошце ёсць — ад **спадарыні Валянціны Гудачковай з Жыткавіч**:

*Не здзіўляйцеся катку,*
*Што «мышкуе» ў...*
*хатульку.*
*Так любы на яго месцы:*
*Ўсё жывое хоча есці.*

І, заўважце (разам з сужэнцамі **Астроўскімі з Мінска**), не абы-што:

*Коцік, шэльма,*
*дужа ласы*
*На яршоў і на каўбасы:*
*Ён,*
*калі нiхто не бачыць,*
*Можа файна*
*«парыбачыць»!*

І пры гэтым — ну чаго толькі не вылавіць!

*Накупіла баба Тася*
*І вяндлянкі, і каўбасак...*
*Недзе затрымалася?*
*Ўсё кату дасталася, —*

шкадуе **спадарыня Гудачкова**.

Ёсць пытанне, каго шкадуе?.. Але спачатку анекдот. «Слухай, табе ўжо 50, — казалі жанчыны старому халасцяку, — а ні жонкі, ні дзяцей... Кату пад хвост — найлепшыя гады!» — «А вы за мяне не хвалюйцеся», — спрабаваў адбіцца мужчына. — «Дык мы ж не за цябе: нам коцю шкада...»

Яшчэ, відаць, і таму, што ён (а крый бог, згаладалы) — можа, як піша **спадарыня Чыгрынава**, есці ўсё што заўгодна. Ну мяркуйце самі:

*Зазірнула неяк Зося*
*На мінутачку да Фросі.*
*Што за хвільку*
*адбылося?*
*У сумцы —*
*мыла засталося.*
*Каб яшчэ пагаманіла,*
*Котка і тое*
*«ўгаварыла» б!..*

Што ўжо казаць пра іншыя кацiныя прысмакі?! Хіба «з падачы» **спадара Мікалая Касмачэўскага з Навапалацка**:

*Цешчы трэба*
*валяр'янка...*
*У аптэку згойсаў Янка.*
*«Адпачні», —*
*спыніў братан,*
*Ды забыўся пра ката,*
*А ў таго на валяр'янку,*
*Што вядома і не дзіва,*
*Нюх —*
*не горшы, чым у Янкі*
*На гарэлку ды на піва!*

У апошні час (на думку **спадарыні Гудачковай**) у ката і новыя «ласункі» з'явіліся:

*Вобшук робіць*
*гэты коцік:*
*Мігам знюхае...*
*наркотык,*
*За вярсту пачуе ён,*
*Хто **развозіць** самагон...*

Карацей, не кот у кадры аб'ектыву, а гатовы (прабачце за паўтор) кадр, то-бок супрацоўнік для нашых памежнікаў ці міліцыі. Прычым выгадны: у адрозненне ад сабак, будкі не патрабуе, есць мала...

Зрэшты, з гэтым вось пагодзяцца не ўсе. Хто-нiхто кажа, што разам з кіскай (нават маленькай) цэлы заапарк у хаце з'яўляецца, бо гэта новая жывёлінка есць, як сабака, спіць, як сурок, гадзіць, як конь, тупае, нібы слон... Да таго ж бегемотам кладзецца на галаву альбо на іншае хворае месца. «Мая котка, — пісала на сваёй старонцы ў «Фэйсбуку» адна жанчына, — разляглася проста на кашальку... І так не памылілася!»

Зрэшты, мы адхіліліся — у прыватнасці, ад тэмы цяпер моднай «развозкі» тавараў, якую ўздымае ў сваіх радках **спадар Віктар Сабалеўскі з Узды**:

*Што за еўра-,*
*за дастаўка —*
*Хоць у пуню,*
*хоць на печ?*
*Пра яе ўвесь двор*
*прамяўкаў:*
*«Дужа ж выгадная рэч»!*
*Мурка з Васькам*
*паспыталі,*
*Каб ад іншых не адстаць.*
*І нарэшце прычакалі...*
*Цяпер клопат:*
*як дастаць?*

Сцяміць гэта каток, тады малайчына. А калі не, — пацвердзяцца словы **спадарыні Ніны Бурко з Бярэзіншчыны**:

*Ёсць у вёсцы рыбаловы:*
*Слабко,*
*Бельскі і Ляшкоў.*
*Як успомняць*
*пра уловы, —*
*На паўдня ў іх размоў!..*
*А тым часам кот Атос*
*У пакет усуне нос:*
*Чуе, бедны —*
*там карась!*
*Ды халява не ўдалась.*

Як трапна заўважае **спадарыня Зоя Наваенка з Глыбоччыны**:

*Быццам блізенька*
*ляжыць*
*А ніяк не ўкусіць!*

Бывае... Прычым — не толькі ў ката, які, дарэчы (на думку **спадарыні Чыгрынавай**) мог знюхаць у пакеце яшчэ і не тое:

*Ні камсы, ні мяса*
*Не ўнюхаў Васька,*
*А на чыпсы з півам*
*Пазірае крыва.*
*Досвед мае горкі*
*(Ён у нас гурман),*
*Нават праз абгортку*
*Унюхае падман!*

Што, згадзіцеся, вельмі важна, бо ён цяпер (па назіраннях **спадарыні Гудачковай**) — амаль на кожным кроку:

*Ежы — поўныя прылаўкі!*
*І ўсюды — хімдабаўкі.*
*Бедны коцік! Гэта ежа*
*Без нажа цябе зарэжа!*
*Лепш бы ты лавіў*
*мышэй,*
*Жыў бы мо крыху даўжэй?*

Адзінае, папрацаваць прыйшлося б, паўпірацца, а не ўсім таго сёння хочацца (як казаў-абураўся адзін з гультаёў: «Сем мільярдаў людзей на зямлі, і ніхто не можа схадзіць за мяне на работу!»)

Пра тое ж, але іншымі словамі **спадар Валерый Гаўрыш**:

*Для чаго трымаць катоў?*
*Каб лавілі пацукоў.*
*Калі ж змалку ім у міскі*
*Насыпаць нязводны*
*«Віскас»,*
*То «пажнеш», браток,*
*напасці:*
*Кацяняты*
*пойдуць красці.*
*...Так, да слова,*
*і ў людзей,*
*Дзе запесцілі дзяцей.*

Высновы — за вамі, як той казаў. Назіранні, дарэчы, таксама:

*У мястэчку —*
*ёсць надзея —*
*Ну зусім няма зладзеяў!*
*Кінь што хочаш, на дварэ*
*Ці пастаў дзе ля платоў,*
*Тут нiхто не падбярэ,*
*Акрамя сабак-катоў! —*

сцвярджае **спадар Мікалай Касмачэўскі** і такім чынам пэўным службам наводку дае. Рэч у тым, што японцы вынайшлі робата, які за пяць хвілін сто злодзеяў ловіць! Не дзіва, што яго ў іншыя краіны купілі. Праўда, і лічбы ў іх атрымаліся іншыя. У Амерыцы, напрыклад, робат за пяць хвілін толькі дваццаць зладзеяў злавіў, а ў суседцы-Расіі за гэткі ж час скралі... самога робата. Ён, як вынікае з радкоў спадара Касмачэўскага, цяпер у адным з нашых мястэчак працуе, можа нават стаць, што будзе лавіць не толькі зладзеяў, — на карупцыю замахнецца, пра якую слушна «сігналізуюць» **спадары Мікалай Старых з Гомеля і Віктар Сабалеўскі з Узды**:

*У суседкі цёткі Дзіны —*
*Вельмі*
*«добрай гаспадыні» —*
*Пастухом працуе воўк*
*(З яго, знаем, які толк)...*
*Шчэ і казла ў гарод*
*пусціла,*
*Чым «нікога» не здзівіла,*
*Ну а сёння ля варот*
*Кот пільнуе антрэкот.*

Гэта — паводле гамяльчаніна. А вось на думку уздзенца...

*Пасвіў воўк авечак*
*(зноўку!),*
*Даглядаў казёл капусту,*
*А загадчыкам сталоўкі*
*Быў пацук стары*
*ды шустры...*
*І каток за працу ўзяўся —*
*«Каштавальнікам»*
*прысмакаў.*
*Жаль, нядоўга*
*пратрымаўся,*
*Нехта даў нагой...*

Вы здагадаліся, куды? І нават самі далі б вось такім «пастухам-даглядчыкам-загадчыкам»? Правільна! Даўно пара!

Ёсць пытанне, ці толькі ім? «Неяк на вуліцы мне сустрэўся адзін мацак, не алкаголік, але ж цвярозым яго мала хто бачыў. А тут, бачу — як шкельца... Кволіцца, бедны, кажа, што з аптэкі ідзе — сардэчных лекаў сабе набраў... Значыць, «збан» такі да пары атруту прымае?» — піша прозай **спадар Іван Сіманёнак з Пастаў.**

Ёсць пра тое ж і вершы:

*Прыхваравў*
*наш «чэмпіён»*
*Па «кульбітах»*
*шклянкі —*
*Перайшоў на рацыён*
*З пахам валяр'янкі.*
*Зніклі тут жа ўсе»сябры»,*
*Здрадзілі малодкі.*
*Па ягоным па двары*
*Ходзяць толькі... коткі.*

Згадзіцеся, сумны фінал, і ён, вось такі, не ў традыцыях нашай рубрыкі. А таму — яшчэ адзін анекдот — з жыццця бландзінак. «Уяўляеш, тыдзень таму прапала мая кіска Ліска, — дзеліцца горам першая. — Праз чатыры дні я яе знайшла, прынесла дамоў... А сёння — мая котка вярнулася!» — «Бедная, — шкадуе Ліску другая бландзінка. — Такое ўзрушэнне перажыць: прыходзіць дамоў, а яна ўжо... дома».

З коткамі ды катамі гэта, вядома ж, здараецца — асабліва ў сакавіку, калі ходзяць налева. Тады (яшчэ Пушкін пісаў) яны заўсёды казкі расказваюць. Мо нават вершаваныя, як **спадар Гаўрыш і спадарыня Алісевіч:**

*Па дарозе з магазіна*
*Янак збочыў да Яніны —*
*Трошкі выпіць, закусіць,*
*Пра жыццё пагаманіць...*
*Пара доўга точыць лясы,*
*Кот — цікуе на кілбасы.*

Альбо:

*Запрасіла нейк сяброўка*
*Ацаніць свае абноўкі...*
*Але й котка*
*не драмала —*
*Ацаніла ў торбе сала.*

І нарэшце:

*У тую краму за хвіліну*
*Зазірнула цётка Ніна,*
*Каб купіць сабе калготкі.*
*Мяса ў торбе ўчула*
*котка...*
*Нарабіла б потым спраў,*
*Каб Кляшчук*
*не ўпільнаваў.*

Ён, фотакарэспандэнт «Звязды» (як заўважылі **сужэнцы Астроўскія з Мінска** ды іншыя чытачы), любіць катоў. На адным ягоным здымку тройка рыжых была, на другім — адзін маленькі на пні, на трэцім — на капоце машыны, белы на спіне ў чорнага каня, на драбіне, на падаконні, парачкай на буфеце пад партрэтам сужэнцаў-гаспадароў, з дзясятак «нічыйных» зімой у вёсцы Маразы... Да таго ж і дома ў спадара Анатоля ёсць котка-прыгажуня. Таму і вось гэтую — на ровары — ён, відаць, не толькі зняў, але і пакарміў — так бы мовіць, «натуршчыцы» аддзячыў натурай, як іншым героям — здымкамі. А калі і не толькі...

У мінулы раз *(гл. нумар «Звязды» за 4.12.2019 г.)* чытачы прыдумвалі подпісі да фота, на якім за работай быў камінар (чысцільшчык комінаў). Дык вось найлепшыя радкі пра яго, паводле меркаванняў вялікага чытацкага журы, склалі **спадарыні Соф'я Кусянкова з Рагачоўшчыны, Валянціна Гудачкова з Жыткавічаў, Любоў Чыгрынава з Мінска, Карына Цануніна з Вілейкі, спадары Іван Сіманёнак з Пастаў, Віктар Сабалеўскі з Узды, сужэнцы Астроўскія з Мінска...**

З чым, у прыватнасці, пагадзілася і маленькае рэдакцыйнае журы. Такім чынам прыз у выглядзе падпіскі на дарагую сэрцу газету «Звязда» на другі квартал 2020 года застаецца ў Мінску.

Хочаце, каб прыходзіў да вас? Тады ўважліва глядзіце на чарговы конкурсны здымак, прыдумвайце подпіс (можна некалькі, але караткіх — не больш за восем радкоў — трапных, прыгожых...) і дасылайце ў рэдакцыю. Шанц на перамогу мае кожны.

**Валянціна ДОЎНАР, Анатоль КЛЯШЧУК.**

***АД ІХ ЖА** шчырыя прабачэнні ўсім (асабліва дэбютантам!), чые творы гэтым разам не прайшлі строгага конкурснага адбору... Затое наступным... Пішыце!*





# ЛОНДАН, ГУД-БАЙ




## Як пачувае сябе Вялікабрытанія на «вольных хлябах»?

**Тыдзень таму Вялікабрытанія пачала адлік новага этапу сваёй найноўшай гісторыі. Брэксіт, які ўжо амаль пераўтварыўся ў далёкую і няспраўджаную мару, нарэшце набыў рэальныя абрысы. Харызматычны прэм'ер-міністр Вялікабрытаніі Борыс Джонсан ўсё-такі выканаў сваё гучнае абяцанне «вывесці краіну з Еўрасаюза або памерці». Адна з ключавых краін супольнасці пакінула ЕС, не дацягнуўшы трох гадоў да 50-гадовага юбілею знаходжання ў арганізацыі. Як гэта ўдалося і што пацягне за сабой такі крок?**

### АПТЫМІСТЫ І СКЕПТЫКІ

24 чэрвеня 2016 года ў Вялікабрытаніі абвясцілі вынікі рэферэндуму аб выхадзе з ЕС. Адна з самых гучных выбарчых кампаній завяршылася перамогай еўраскептыкаў, хоць і з зусім нязначнай перавагай. За Brexit прагаласавалі 51,9 працэнта брытанскіх грамадзян супраць — 48,1. Ідэя выхаду з Еўрасаюза набрала папулярнасць пасля грэчаскага эканамічнага крызісу, нагадвае gazeta.ru. Яшчэ большы імпульс размовам пра Brexit надаў міграцыйны крызіс у Еўропе. На думку еўраскептыкаў, выхад з ЕС мог бы засцерагчы краіну ад еўрапейскіх эканамічных праблем і абмежаваць колькасць мігрантаў. Прыхільнікі Brexit настойвалі, што сяброўства ў аб'яднанні толькі перашкаджае развіццю Злучанага Каралеўства, адымаючы ў краіны мільярды фунтаў і нічога не прапаноўваючы наўзамен.

Абурэнне многіх брытанцаў пры гэтым выклікала статыстыка па галасаванні. Так, паводле дадзеных YouGov, за Brexit галасавалі пераважна грамадзяне старэйшыя за 50 гадоў. Акрамя таго, даследаванні прадэманстравалі, што чым больш у акрузе людзей з вышэйшай адукацыяй, тым большай аказалася падтрымка сяброўства ў ЕС. Супраць выхаду Брытаніі з Еўрасаюза прагаласаваў Лондан, Паўночная Ірландыя і Шатландыя, якая практычна адразу заявіла пра гатоўнасць пакінуць Злучанае Каралеўства і стаць членам ЕС. Астатняя ж краіна практычна аднадушна прагаласавала за выхад.

Курс фунта да долара адразу пасля выхаду першых папярэдніх даных знізіўся да мінімальных з 1985 года значэнняў, прабіўшы адзнаку $1,32 за £1. Брытанцы гадалі, што будзе рабіць прэм'ер-міністр Дэвід Кэмеран — галоўны ідэолаг палітыкі захавання членства ў ЕС і да ўсяго ініцыятар рэферэндуму. Ёнператварыў плебісцыт у інструмент выбарчай кампаніі на парламенцкіх выбарах у 2015 годзе. Кэмеран паабяцаў, што калі кансерватары выйграюць, то ён правядзе галасаванне аб выхадзе з Еўрасаюза.

Іронія ў тым, што, акрамя інструмента ў выбарчай кампаніі, рэферэндум стаў для прэм'ера элементам палітычнай стратэгіі. Яшчэ ў 2013 годзе ён расказаў, што Лондан павінен быць часткай ЕС, аднак на іншых умовах. У прыватнасці, палітык хацеў дамагчыся змен у галіне міграцыйнага заканадаўства і сацыяльных ільгот. Такім чынам ён разлічваў паставіць кропку ў спрэчцы аб мэтазгоднасці членства Злучанага Каралеўства ў садружнасці, а таксама, калі атрымаецца дамовіцца з Бруселем аб новых умовах суіснавання. Іншымі словамі, Дэвід Кэмеран быў упэўнены ў перамозе еўрааптымістаў на рэферэндуме. Прэм'ер-міністр пайшоў ва-банк і прайграў. Раніцай 24 чэрвеня на Даўнінг стрыт, 10 Кэмеран заявіў, што сыходзіць у адстаўку. «Я біўся супраць выхаду ўсім сваім сэрцам, але брытанцы абралі іншы шлях. Значыць, ім патрэбны новы прэм'ер-міністр», — сказаў ён. Чарговым кіраўніком брытанскага ўрада 13 ліпеня 2016-га стала Тэрэза Мэй — праціўніца выхаду краіны з Еўрасаюза. «Brexit азначае Brexit», — паўтарала яна падчас выбарчай кампаніі за месца лідара Кансерватыўнай партыі і, адпаведна, крэсла прэм'ер-міністра. «Мы перажываем важны гістарычны момант для нашай краіны. Пасля рэферэндуму трэба будзе прайсці праз часы велічэзных нацыянальных перамен, і я ведаю, што мы — Вялікабрытанія — прымем выклік, — сказала Мэй падчас свайго першага звароту да нацыі. — Улічваючы, што мы выходзім з ЕС, даможамся для сябе новай, важнай і пазітыўнай ролі ў свеце».

У маі 2019-га Тэрэза Мэй са слязамі на вачах абвясціла аб сваёй адстаўцы. За гэты час яна будзе ўзгадняць з Бруселем 500-старонкавае пагадненне аб «разводзе», якое тройчы не пройдзе ўзгадненне ў парламенце. Дамагчыся саступак ад Еўрасаюза прэм'еру таксама не атрымаецца.

### ДЗЕНЬ НЕЗАЛЕЖНАСЦІ

Толькі праз тры з паловай гады лёс Brexit трапіў у рукі чалавека, здольнага давесці пачатае да канца. Летась 24 студзеня пераемнік Мэй Борыс Джонсан, адзін з галоўных еўраскептыкаў, ідэолаг кампаніі за Brexit, падпісаў пагадненне аб выхадзе Вялікабрытаніі з Еўрасаюза. «Падпісанне пагаднення — надзвычайны момант, калі, нарэшце, выконвацца вынік рэферэндуму 2016 года і заканчваюцца зацяглыя гады спрэчак і рознагалоссяў», — заявіў Джонсан, апрануты ў колеры брытанскага сцяга, у ходзе цырымоніі.

З парламентам Джонсану даводзілася пазмагацца: каб мець магчымасць прасоўваць сваю палітыку і спыніць шматлікія адтэрміноўкі Brexit, прыйшлося распусціць палату абшчын і пайсці на пазачарговыя выбары. У парламенце папросту адсутнічала большасць, якая прасоўвала б неабходную пазіцыю, ці то новы рэферэндум, выхад без здзелкі або падтрымка існуючага пагаднення. Такім чынам, датэрміновыя выбары далі брытанцам магчымасць прадэманстраваць сваю волю адносна будучыні краіны — з ЕС або без яго. Вынікі пераўзышлі ўсе чаканні: кансерватыўная партыя Джонсана, заняўшы 364 з 650 месцаў у палаце абшчын, атрымала найбуйнейшую перамогу з 1987 года, калі такога ж поспеху дамаглася Маргарэт Тэтчэр.

«Гэта новы кірунак для незалежнай, суверэннай Вялікабрытаніі, наперадзе — дзесяцігоддзе абнаўлення і новых магчымасцяў», — заявіў кіраўнік МЗС краіны Дамінік Рааб. «Мы зніжаем гандлёвыя бар'еры паміж краінамі, працуем па пытаннях змены клімату або паляпшаем жыццё людзей ва ўсім свеце, наша бачанне па-сапраўднаму ўпісанай у глабальны свет Брытаніі стане асновай для добрых спраў», — высакамоўна адзначыў Рааб перад пачаткам апошняга для брытанскіх дэпутатаў пасяджэння ў Еўрапарламенце, на якім вынесілі заключнае рашэнне па працэдуры Brexit. За выхад Брытаніі з Еўрасаюза ўвыніку прагаласаваў 621 парламентарый, супраць — 49.

Развітанне прайшло эмацыянальна. Пераходзячы ў разрад былых калег, палітыкі моцна ціснулі адзін аднаму рукі і са слязамі на вачах спявалі «Стары добры час» («Auld Lang Syne») — шатландскую песню, якую традыцыйна выконвалі ў Новы год, а потым і па іншых святах. Дэпутаты адзін за адным падымаліся з месцаў, каб прамовіць апошніе слова.

У Брытаніі кансерватыўная партыя святкавала свой трыумф на снежаньскіх выбарах і перамогу лозунга Борыса Джонсана «Здзейсні Brexit!» (Get Brexit done). На сайце партыі можна было замовіць памятныя сувеніры, але ўжо са слоганам «Здзейсніл і Brexit!» (Got Brexit done). Кухонны ручнік з выявай Джонсана ўнутры вянку з брытанскім сцягам каштаваў 12 фунтаў, такі ж магніт — шэсць, значок з дэвізам прэм'ера — пяць.



Увечары 31 студзеня адсвяткаваць «дзень незалежнасці» Вялікабрытаніі ад ЕС на вуліцы Лондана выйшлі тысячы людзей. Брытанцы палічылі выхад краіны з Еўрапейскага саюза праз тры з паловай гады пасля рэферэндуму сваёй перамогай над палітычнай элітай Вялікабрытаніі, паведаміла CNN. Асноўным месцам святкавання «разводу» Лондана і Бруселя стала Парламенцкая плошча.

### ПАСЛЯ «РАЗВОДУ»

Аднак Brexit — яшчэ не канец працэдуры. На працягу 11 месяцаў (да 31 снежня 2020 года) будзе доўжыцца так званы транзітны перыяд. Дэталёвае абмеркаванне будучых абрысаў супрацоўніцтва пачнецца, па некаторых даных, у пачатку сакавіка. Галоўная мэта — распрацаваць механізм, па якім Брытанія захавае выгады ад агульнага з ЕС рынка і Мытнага саюза, але не будзе больш прадстаўлена ў розных органах Еўрасаюза і пазбавіцца права ўплываць на прыняцце палітычных рашэнняў. Падчас транзіту Лондан працягне прытрымлівацца агульнаеўрапейскіх законаў, але прапаноўваць новыя ініцыятывы не зможа.

У тэорыі, калі дамовіцца аб новых правілах не паспеюць, транзіт можна падоўжыць на два гады, але Борыс Джонсан ужо выступіў катэгарычна супраць зацягвання працэсу, паколькі яго аднапартыйцы не ўхвалілі б такога развіцця падзей. Ключавой тэмай абмеркавання стане гандлёвае супрацоўніцтва. У першую чаргу, у перыяд транзіту гандлёвыя адносіны бакоў не зменяцца. Па яго заканчэнні Брытанія пакіне Мытны саюз ЕС і выйдзе з пагаднення аб свабодным гандлі, па якім брытанскія тавары могуць свабодна перамяшчацца па Еўропе без праверак і тарыфаў. Бакам трэба будзе заключыць новы дагавор. За гэты час таксама трэба будзе вызначыцца, як брытанска-еўрапейскае супрацоўніцтва будзе выглядаць у іншых сферах: правасуддзі, бяспецы і абмене дадзенымі, авіяцыйных стандартах, доступе да водаў для лоўлі рыбы, пастаўках электрычнасці і газу, ліцэнзаванні медыцынскіх прэпаратаў.

Працэдуру мяркуюць завяршыць да канца лістапада 2020 года. Да гэтага моманту дагавор павінен быць абмеркаваны, правераны і прадстаўлены Еўрапарламенту. 31 снежня 2020 года стане пунктам незвароту, да гэтага моманту пагадненне аб свабодным гандлі павінна быць ратыфікавана. Калі гэтага не адбудзецца, Брытанія будзе гандляваць з ЕС па правілах Сусветнай гандлёвай арганізацыі. Такі варыянт некаторыяназіральнікі прыраўноўваюць да выхаду без пагаднення, якога так імкнуліся пазбегнуць. Фінальны акорд прагучыць у апошні дзень 2022 года. Гэта крайняя дата, да якой можа быць прадоўжаны транзітны перыяд. Да гэтага моманту ўсе спрэчныя пытанні ў тэорыі канчаткова ўладзяць.

### АКНО МАГЧЫМАСЦЯЎ

Другая па велічыні еўрапейская эканоміка паказала рэкордна нізкія тэмпы росту прадукцыйнасці працы за апошнія 10 гадоў. Запавольнене прызнана найгоршым з часоў Прамысловай рэвалюцыі, якая пачалася 250 гадоў таму. Пра гэта паведаміла газета The Guardian са спасылкай на даследаванне навукоўцаў з Універсітэта Сэсекса і Лафбара. Адной з прычын стагнацыі навукоўцы назвалі наступствы Brexit. У бліжэйшай перспектыве брытанская эканоміка будзе паказваць слабы рост, лічаць эксперты.

Выхад Вялікабрытаніі са складу Еўрапейскага саюза, які ўжо каштаваў казне краіны больш за 170 мільярдаў долараў, можа абярнуцца для Злучанага Каралеўства праблемамі не толькі эканамічнага характару. Змены ўжо адбываюцца і яны не заўжды станоўчыя. Напрыклад, выхад з Еўрасаюза прывёў да ўсплёску ксенафобскіх настрояў. Як паведамляе брытанскае выданне Guardian, у адным з дамоў у горадзе Норыдж у графстве Норфалк з'явілася аб'ява непрымальнага зместу: «Мы зноў здабылі нашу вялікую краіну і не пацерпім, каб жыхары кватэр гаварылі на іншых мовах, акрамя мовы каралевы Лізаветы — англійскай. У адваротным выпадку вяртайцеся адкуль прыехалі, і вярніце кватэры дзяржаве, каб у іх маглі жыць брытанцы». Гэты заклік пад назвай «Шчаслівага брэксіту» быў прылеплены да пажарных шчытоў на ўсіх 15 паверхах дома. Гаворка ідзе пра так званае сацыяльнае жыллё, шматкватэрныя блокі з нізкай арэнднай платай, у якіх кватэры выдаюцца сем'ям з нізкім дастаткам і мігрантам. Улады Норыджа заявілі, што маюць намер адрэагаваць жорстка.

Брэксіт спарадзіў яшчэ адзін галаўны боль для Лондана. Кіраўнік урада шатландскай аўтаноміі Нікола Стэрджэн паабяцала, што Шатландыя вернецца ў Еўрапейскі саюз, але ўжо ў якасці незалежнай дзяржавы. Мітынгі і шэсці супраць брэксіту прайшлі ў Эдынбургу, Глазга, Абердзіне, Дандзі і іншых шатландскіх гарадах. У Шатландыі ўсё часцей гаворка заходзіць аб новым рэферэндуме аб незалежнасці, піша швейцарскае выданне Tages-Anzeiger.

Аднак ужо відавочныя і станоўчыя моманты. Брэксіт можа стаць новым акном магчымасцяў для ўмацавання супрацоўніцтва Вялікабрытаніі і Беларусі. Такое меркаванне выказаў пасол Беларусі ў Вялікабрытаніі Сяргей Алейнік у праграме «Контуры» на тэлеканале АНТ. На працягу апошніх гадоў Злучанае Каралеўства ўстойліва займае трэцяе месца па аб'ёме экспарту беларускай прадукцыі пасля Расіі і Украіны, а таксама другое — па аб'ёмах інвестыцый у эканоміку Беларусі. З улікам таго, што Лондан — глабальны фінансавы цэнтр, на думку Сяргея Алейніка, ёсць вялікі патэнцыял для развіцця супрацоўніцтва ў банкаўскай і фінансавай сферах. Як заўважыў пасол, «Беларусь разлічвае на працяг прагматычнага і канструктыўнага супрацоўніцтва з Вялікабрытаніяй і развіццё адносін па ўсіх ключавых сферах нашага ўзаемадзеяння».

**Захар БУРАК.**

**ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Жлобинский механический завод «Днепр» (продавец) в лице ликвидатора ОАО «Жлобинский механический завод «Днепр» – директора ООО «Модель антикризисного управления» Куценковой Н. С. извещает о проведении 26 февраля 2020 года открытого повторного аукциона по продаже имущества со снижением начальной цены на 30 % в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20**

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС (20 %), бел. руб. | Сумма задатка, с учетом НДС (20 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|
| **Условие продажи:** победитель (единственный участник) аукционных торгов самостоятельно и за свой счет проводит демонтаж, погрузку, транспортировку приобретенного на аукционе имущества. В случае нарушения целостности имущества Продавца при демонтаже и погрузке приобретенного имущества на Покупателя возлагается обязанность по приведению поврежденного имущества в первоначальное состояние. Действия по снятию с регистрационного учета транспортных средств (автотехники и механизмов), а также в случае необходимости получения регистрационных документов (при их отсутствии у Продавца) производится Покупателем на основании выданной доверенности Продавцом, за его счет и его силами. Переоформление документов на автотехнику и механизмы производится за счет покупателя. **Местонахождение:** Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, ул. Школьная, д. 8 | | | |
| 1 | Аппарат газированной воды «Полесье» АП-60, инв. № 61380 | **1050,00** | 105,00 |
| 2 | Аппарат для приварки шпилек RSR2500, инв. № 61355 | **1330,00** | 133,00 |
| 3 | Печь электротермич. СШЦМ, инв. № 40127 | **14 140,00** | 1414,00 |
| 4 | Пресс К-1930, инв. № 50164 | **3990,00** | 399,00 |
| 5 | Пресс гидравлический П6332Б, инв. № 50161 | **13 580,00** | 1358,00 |
| 6 | Комплект станочного оборудования UX Work shop Spec.Package «L+» с уст-кой моечной RG10, инв. № 61298 | **47 600,00** | 4760,00 |
| 7 | Вертикальн. сверлильн. ст. 2Г-125, инв. № 50147 | **1120,00** | 112,00 |
| 9 | Пресс КЕ-2330, инв. № 60349 | **4200,00** | 420,00 |
| 10 | Пресс КЕ-2330, инв. № 60350 | **4200,00** | 420,00 |
| 11 | Снегоочиститель тракторный СТ-1500, инв. № 61269 | **1470,00** | 147,00 |
| 12 | Станок настольно-сверлильный ГС 2116К, инв. № 60979 | **1540,00** | 154,00 |
| 13 | Станок трубогибочный СТД-439, инв. № 50232 | **280,00** | 28,00 |
| 14 | Полуавтомат сварочный Origo Nig 502c, инв. № 61213 | **2660,00** | 266,00 |
| 15 | Полуавтомат сварочный ПДГ 251, инв. № 60478 | **469,00** | 46,90 |
| 16 | Эл. печь СНЗ-3.6, инв. № 40125 | **2520,00** | 252,00 |
| 17 | Молот ковочный, инв. № 50223 | **4620,00** | 462,00 |
| 18 | Ножницы Н-3121, инв. № 50151 | **2100,00** | 210,00 |
| 19 | Пресс 2135-М 40 ТН., инв. № 50297 | **1120,00** | 112,00 |
| 20 | Пресс гидравлич. П6330, инв. № 50226 | **7840,00** | 784,00 |
| 21 | Станок токарно-винторезный 16К20, инв. № 60339 | **2310,00** | 231,00 |
| 22 | **Автомобиль KAVZ 3270**, рег. № 8526 ГСН, г. в. 1989, цвет – бело-синий, тип ТС – автобус-вагон, инв. № 8526 | **1260,00** | 126,00 |
| 23 | **Автомобиль ЗИЛ-133ГЯ КС-3575А**, тип машины – специальная, тип кузова – крановая установка, 1988 года выпуска, рег. знак 4041 ГСН | **3780,00** | 378,00 |
| 24 | **Автомобиль МАЗ 437043**, рег. № АЕ 0296-3, г. в. 2008, цвет – белый, тип ТС – грузовой бортовой, инв. № 61005 | **5880,00** | 588,00 |
| 25 | **Автомобиль МАЗ 437043**, рег. № АЕ 0297-3, г. в. 2008, цвет – белый, тип ТС – грузовой бортовой, инв. № 61006 | **5880,00** | 588,00 |
| 26 | **Полуприцеп малогабаритный тракторный ПМТ-30,** рег. № ЕВ 38207, г. в. 2012, инв. № 61242 | **2520,00** | 252,00 |
| 27 | Стол поворотный, инв. № 60463 | **1820,00** | 182,00 |
| 29 | Таль электрическая, г/п 3 тн, инв. № 50707 | **630,00** | 63,00 |
| 30 | Таль электрическая, г/п 1 тн, инв. № 50235 | **420,00** | 42,00 |
| 31 | Таль электрическая, г/п 1 тн, инв. № 50129 | **350,00** | 35,00 |
| 32 | Таль электрическая, г/п 0,5 тн, инв. № 50139 | **280,00** | 28,00 |
| 33 | Таль электрическая, г/п 0,5 тн, инв. № 50019 | **280,00** | 28,00 |
| 34 | Кран-балка электрическая, г/п 3 тн, инв. № 50137 | **2030,00** | 203,00 |
| 35 | Кран-балка электрическая, г/п 3 тн, инв. № 50134 | **2030,00** | 203,00 |
| 36 | Кран-балка электрическая, г/п 3 тн, инв. № 50130 | **2030,00** | 203,00 |
| 37 | Кран-балка электрическая, г/п 2 тн, инв. № 50752 | **2380,00** | 238,00 |
| 38 | Кран-балка электрическая, г/п 3 тн, инв. № 50131 | **2030,00** | 203,00 |
| 39 | Кран-балка электрическая, г/п 2 тн, инв. № 50236 | **2380,00** | 238,00 |
| 40 | Кран-балка г/п 2 тн, инв. № 50751 | **2380,00** | 238,00 |
| 41 | Кран электрический, г/п 3,2 тн, инв. № 50136 | **2800,00** | 280,00 |
| 42 | Кран электрический, г/п 2 тн, инв. № 50122 | **2380,00** | 238,00 |
| 43 | Кран электрический, г/п 1 тн, инв. № 50119 | **2100,00** | 210,00 |
| 44 | Кран мостовой, г/п 5 тн, инв. № 50106 | **4270,00** | 427,00 |
| 45 | Кран мостовой, г/п 10 тн, инв. № 50104 | **6720,00** | 672,00 |
| 46 | Консольно-поворотная балка, г/п 0,5 тн, инв. № 50700 | **560,00** | 56,00 |
| 47 | Электротельфер, г/п 2 тн, инв. № 50124 | **770,00** | 77,00 |
| 48 | Таль электрическая, г/п 3 тн, инв. № 50705 | **840,00** | 84,00 |
| 49 | Кран-балка электрическая, г/п 3 тн, инв. № 50128 | **1750,00** | 175,00 |
| 50 | Электроталь, г/п 1 тн, инв. № 50706 | **560,00** | 56,00 |
| 51 | Электротельфер, г/п 3 тн, инв. № 50704 | **840,00** | 84,00 |
| 52 | Токарно-винторезный станок 1М63ДФ101, инв. № 50083 | **4270,00** | 427,00 |
| 53 | Токарно-винторезный станок 1В-62Г, инв. № 60486 | **3500,00** | 350,00 |
| 54 | Гидроподъемник, инв. № 60629 | **6860,00** | 686,00 |
| 55 | Трубогиб ТГБ-00.00.000СБ, инв. № 60664 | **700,00** | 70,00 |
| 56 | Трубогиб ТГМ-00.00.00СБ, инв. № 60663 | **350,00** | 35,00 |
| 57 | Машина термической резки «Комета М-П-1Пл-2К-П-2.5-8-8-1, инв. № 60891 | **50 610,00** | 5061,00 |
| 58 | Рольганг для вальцов, инв. № 61378 | **560,00** | 56,00 |
| 59 | Рольганг приемный и подающий к ленточно-пильному станку ц. № 3, инв. № 60965 | **3080,00** | 308,00 |
| 60 | Ленточнопильный станок ARG-250 Plus SAF, инв. № 61153 | **8120,00** | 812,00 |
| 61 | Станок ленточнопильный РР 362 G, инв. № 60952 | **24 010,00** | 2401,00 |
| 62 | Станок листогибочный гидравлический 4-валковый AHS 25/20, инв. № 61376 | **122 710,00** | 12 271,00 |
| 63 | Горн кузнечный, инв. № 121006 | **280,00** | 28,00 |
| 64 | Генератор высокочастотный В4Г7-60/0,066, инв. № 141 | **1120,00** | 112,00 |
| 65 | Рольганг, подающий к столу ленточнопильного станка, инв. № 20310 | **840,00** | 84,00 |
| 66 | Стол к ножницам, инв. № 12106 | **210,00** | 21,00 |
| 67 | Рольганг КН-481, инв. № 50753 | **840,00** | 84,00 |
| 68 | Комплекс АКНА-3225, инв. № 50609 | **15 750,00** | 1575,00 |
| 69 | Пресс гидравлический, инв. № 50605 | **8960,00** | 896,00 |
| 70 | Пресс КЕ 2330, инв. № 50348 | **7210,00** | 721,00 |
| 71 | Пресс листогибочный кривошипный И-1330, инв. № 50172 | **3920,00** | 392,00 |
| 72 | Пресс-ножницы НВ-5221, инв. № 50606 | **1680,00** | 168,00 |
| 73 | Продольно-строгальный СТ 7210, инв. № 50169 | **9800,00** | 980,00 |
| 74 | Молот кузнечный М415А, инв. № 131 | **7700,00** | 770,00 |
| 75 | Ножницы для резки металла, инв. № 137 | **4760,00** | 476,00 |
| 76 | Ножницы гильятинные, инв. № 140 | **4830,00** | 483,00 |
| 77 | Пресс-ножницы 5х85, инв. № 50224 | **2030,00** | 203,00 |
| 78 | Токарно-винторезный станок «Монарх», инв. № 60577 | **13 300,00** | 1330,00 |

**Продавец:** открытое акционерное общество «Жлобинский механический завод «Днепр», 247210, Гомельская область, г. Жлобин, ул. Школьная, 8. Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел.: **8 (029) 303-53-09, Григорович Павел Карлович. Шаг аукционных торгов –** 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона и не изменяется в течение всего аукциона. **Для участия в аукционе необходимо: 1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора торгов (ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга»):** р/с BY52 BLBB 3012 0400 0712 0400 1001, БИК BLBBBY2X, дирекция ОАО «Белинвестбанк» по Гомельской области, УНП 400071204, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах **(задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления). 2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 11 февраля 2020 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга», в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00. **Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 24 февраля 2020 г. в 16.00 включительно. Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются.** Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за **три** дня до его проведения.

